ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

4 СТУДЗЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР №2 (28618)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Адукацыя на адлегласці



Мазаічная Амерыка



Майстэрства ідэальнага шва

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Указ № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання» дазволіць істотна павялічыць колькасць аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу. Ёсць упэўненасць, што падобна аграэкатурызму мы атрымаем развіццё бізнесу ў сферы прыдарожнага сэрвісу. Таксама хачу нагадаць, што Дэкрэтам № 7 істотна скарочаны пералік санітарных і пажарных нормаў і правілаў для аб'ектаў грамадскага харчавання. Пералікі зацверджаны Прэзідэнтам, каб бюракратыя не спрабавала зноў іх мяняць, штосьці даўнесці. Для бізнесу вельмі важна ведаць, што правілы не мяняюцца. Правілы могуць быць добрыя, дрэнныя, але яны павінны быць стабільныя».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9790 | ▲ |
| Еўра | 2,3814 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0710 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Хто сказаў, што час не для прагулак?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхарка Кастрычніцкага раёна сталіцы Таццяна НАСЕВІЧ з двухгадовай дачкой Марыяй і хатнім гадаванцам па мянушцы Флінк гуляюць па мокрых студзеньскіх вуліцах.**

■ Фінансы

## КАПЕЙКА ТАЛЕР БЕРАЖЭ

### Першая беларуская крыптавалюта: якая яна?

**На прэс-канферэнцыі, прысвечанай гэтай падзеі, было шматлюдна: на дыялог пра беларускую версію біткойна прыйшлі не толькі журналісты, але і работнікі IT-сферы, студэнты, эканамісты і нават пенсіянеры. Нягледзячы на той факт, што сустрэча павінна была адбыцца яшчэ восенню (арганізатары чакалі прыняцця Дэкрэта «Аб лічбавай эканоміцы»), цікавасць да мерапрыемства была непадробная. Дык хто ж стварыў першую айчынную крыптавалюту і як яна працуе?**



Спачатку — невялікі экскурс у тэорыю. Крыптавалюта — гэта асаблівы тып электроннага плацежнага сродку. Інакш кажучы, гэта толькі матэматычны код. Называецца яна так з-за таго, што пры абарачэнні гэтых лічбавых грошай выкарыстоўваюцца крыптаграфічныя элементы, а менавіта — электронны подпіс. Крыптавалюта не існуе ў папяровым выглядзе ці ў манетах, яна ёсць толькі ў лічбавай рэальнасці.

СТАР. 4

■ «Звязда» даследуе праблему

## ШТРАФЫ КАРАЮЦЬ СЯМ'Ю, А НЕ ТЫРАНА

### Што перашкаджае жанчынам абараніць сябе ад хатняга гвалту



**Паводле міжнароднай статыстыкі, жанчыне, пацярпелай ад хатняга гвалту, патрэбна зрабіць пяць—сем спроб сысці ад агрэсара, перш чым яна канчаткова парве з ім адносіны. І справа не толькі ў стэрэатыпе «б'е — значыць любіць». Якія бар'еры ў заканадаўстве перашкаджаюць беларускам абараніць сябе ад хатняга гвалту, паспрабуем разабрацца з дапамогай экспертаў.**

### Непад'ёмная пошліна і адмова ў разводзе

Найбольш аптымальнае вырашэнне сітуацыі — з'ехаць ад агрэсара. Але ў сілу розных умоў гэта не заўсёды магчыма.

— Калі жыллё носіць статус арэнднага ці сацыяльнага карыстання, то жанчына не можа яго ні падзяліць, ні памяняць. Падобная сітуацыя ўзнікае з кватэрамі, пабудаванымі па льготным крэдытаванні: так, іх можна прадаць праз пэўны час пасля выплаты запазычанасці, але тут і цяпер нельга нічога зрабіць. Яшчэ адзін сур'ёзны бар'ер — непад'ёмная для многіх дзяржаўная пошліна пры падзеле маёмасці. Яна складае пяць працэнтаў ад кошту часткі кватэры, на якую прэтэндуе жанчына. Ёсць магчымасць частковага або поўнага вызвалення ад пошліны, але, на жаль, суддзі рэдка прыбягаюць да такой практыкі. Мне здаецца, што ўсё ж такі трэба індывідуальна падыходзіць да кожнай сітуацыі. Калі жанчына сутыкаецца з хатнім гвалтам, жыць асобна ад агрэсара — гэта неабходнасць для яе бяспекі, — лічыць **юрыст цэнтра па прасоўванні правоў жанчын «Яе правы» Лілія ВОЛІНА.**

СТАР. 4

■ Перспектыва

# БЮДЖЭТ НА ПАЛЬЦАХ:

## Планы на будучыню і першыя вынікі фінансавага 2017-га

**З 1 студзеня запрацаваў і бюджэт на новы, 2018 год. Адпаведны закон кіраўнік краіны падпісаў 31 снежня. За аснову, як ужо паведамлялася, прыняты кансерватыўны сцэнарый, але прагнозы даволі аптымістычныя. Прынамсі, асобныя сферы абяцаюць прырасці за год на пяць і болей працэнтаў.**

### Кансерватыўны — гэта які?

Пры ім тэмп росту валавога ўнутранага прадукту (ВУП) складзе 101,2 %. А сярэднегадавыя параметры: інфляцыя — 107,4 %, стаўка рэфінансавання — 11 % гадавых. Цана на нафту закладзена ў памеры 43 долараў ЗША за бараль, курс долара ЗША — 2,038 беларускага рубля, курс расійскага рубля — 62,3.

Аб'ём даходаў рэспубліканскага бюджэту прагназуецца ў суме 20,485 мільярда рублёў, або 107,5 — 107,8 % да даходаў бягучага года. Расходы — 19,751 мільярда. Прафіцыт складзе звыш 730 мільёнаў рублёў, гэтыя грошы пойдуць на пагашэнне часткі дзяржаўнага доўгу.

### Па рэгіёнах

Калі глядзець па абласцях, то, згодна з прынятымі праектамі іх бюджэтаў, закладзены або невялікі прафіцыт, або некаторы дэфіцыт.

У апошні тыдзень снежня на сумесным пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама і сесіі абласнога Савета дэпутатаў быў зацверджаны бюджэт рэгіёна ў памеры 2,1 мільярда рублёў. Расходы складуць прыкладна столькі ж, прынамсі, фігуруе лічба 2,1 мільярда. Аднак «за коскай» усё ж закладзены дэфіцыт. Невялікі — 2,4 мільёна рублёў. Выкліканы ён больш, чым паважнай прычынай — фінансаваннем выдаткаў на падрыхтоўку да 1000-гадовага юбілею Брэста.

А вось Віцебшчына разлічвае на невялікі прафіцыт у сваім бюджэце. Запланавана, што даходы вобласці ў 2018 годзе складуць 1 мільярд 921 мільён рублёў, расходы — 1 мільярд 872 мільёны. Прафіцыт пойдзе на выкананне даўгавых абавязацельстваў органаў мясцовага кіравання.

Па гэтым жа шляху плануе пайсці і Гродзеншчына. У яе бюджэце таксама запланаваны невялікі прафіцыт у памеры 17 мільёнаў рублёў. Гэтыя грошы плануецца накіраваць на пагашэнне аблігацыйных займаў, якія выпусцілі мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы вобласці.

Бюджэт сталіцы перавышае ў разы бюджэт кожнага з рэгіёнаў, але, на жаль, для яго характэрны і значна большы дэфіцыт. Прагназуемы аб'ём даходаў у 2018-м — 4 мільярды 286 мільёнаў, расходаў — 4 мільярды 462 мільёны.

### Час лічыць куранят

Ужо студзень 2018-га, а значыць, можна падвесці першыя вынікі — фінансавыя — мінулага года. А яны неблагія. Прынамсі, як прагназаваў у лістападзе прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй Кабякоў, даходы бюджэту ў 2017-м павінны перавысіць запланаваныя аж на 1,1 мільярда.

Так, на той момант за дзесяць месяцаў рэспубліканскі бюджэт быў выкананы з прафіцытам у 3,4 мільярда беларускіх рублёў, кансалідаваны — на 4,4 мільярда. «Даходы па годзе ацэньваюцца вышэй, чым планавалі, на 1,1 мільярда рублёў», — адзначыў прэм'ер-міністр. Умовы, пры якіх фарміраваўся бюджэт за 2017 год, адрозніваюцца ад фактычных, з якімі давялося працаваць, — на шчасце, у лепшы бок. Напрыклад, бюджэт на 2017 год разлічваўся, з меркаваннем, што цана за бараль нафты складзе 35 долараў, на самай жа справе бараль нафты каштаваў 52 долары.

Паказалі мы добрыя лічбы і ў плане прыросту ВУП. У праекце бюджэту на 2017-ы рост планаваўся мінімальны — на ўзроўні 100,2 %. Аднак месяц таму ўрад на пасяджэнні падлічыў, што па выніках года чакаецца прырост у памеры двух працэнтаў.

У праекце рэспубліканскага бюджэту стаўка рэфінансавання на 2017 год закладвалася ў памеры 15—17 %. Планавалася яе паступова памяншаць. Згодна з Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны на 2016—2020 гады, да канца 2020 года стаўка рэфінансавання павінна скласці 9—11 % гадавых. Паказальна, што верхняй планкі гэтай мэты мы ўжо дасягнулі — 18 кастрычніка стаўка рэфінансавання была ўстаноўлена на 11 %. А толькі ў пачатку 2016 года гэты паказчык быў на ўзроўні 25 %!

Трэба сказаць, што чым ніжэйшая працэнтная стаўка, тым больш надзейнай выглядае фінансавая сітуацыя ў краіне і тым больш даступныя грошы — гэта значыць, крэдыты. А далей формула простая: чым больш яны даступныя, тым больш іх укладваецца ў эканоміку, як вынік — яна развіваецца.

### Падставы для аптымізму

Прычым, аптымізму цалкам здарова, абгрунтаванага. Вядучыя галіны эканомікі па працягу 2017-га дэманстравалі ўпэўнены рост. Мяркуецца, што гэта тэндэнцыя будзе характэрна і для 2018 года. Як адзначыў падчас выступлення перад парламентарыямі ў мінулым месяцы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка, асноўны ўнёсак у эканоміку 2017 года зрабіла прамысловасць. Ён значна больш высокі, чым ва ўсіх астатніх валаўтваральных галін эканомікі. Так, за дзесяць месяцаў 2017 года рост прамысловай вытворчасці дасягнуў 106,2 %, а за 11 — 106,3 %. Свае вынікі пачалі даваць і мадэрнізацыя, і экспартная палітыка дзяржавы.

Добрыя тэмпы дэманструюць таксама па выніках студзеня—лістапада 2017 года сферы транспарту — 105,5 % і сельскай гаспадаркі — 105,1 %.

### Сацыяльная скіраванасць

Як і ў папярэднія гады, бюджэтная палітыка нашай дзяржавы захоўвае сваю сацыяльную скіраванасць.

У агульным аб'ёме кансалідаванага бюджэту 65 % займаюць так званыя першачарговыя выдаткі — на выплату зарплаты і трансфертаў насельніцтву, абслугоўванне дзярждоўгу, набыццё лекаў, прадуктаў харчавання, аплату камунальных паслуг і міжбюджэтныя трансферты. Трэць кансалідаванага бюджэту складаюць выдаткі на заработную плату ў суме 10,6 мільярда рублёў.

У бягучым годзе плануецца істотна павялічыць бюджэтныя асігнаванні на адукацыю, ахову здароўя, а таксама на павышэнне заробкаў. Так, на адукацыю будзе выдзелена на 9,6 % больш, чым летась, на ахову здароўя — на 3,5 %. У цэлым з кансалідаванага бюджэту на гэтыя галіны прадугледжваецца адпаведна 5,6 мільярда і 4,8 мільярда рублёў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# ДАДАЛОСЯ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

**Пра тое, наколькі 2017-ы стаў паспяховым для Нараўлянскага раёна, мы запыталі ў старшыні райвыканкама гэтага рэгіёна Валерыя ШЛЯГІ.**



***— Па выніках мінулага года як складваецца сітуацыя ў раёне па стварэнні новых працоўных месцаў і павышэнні заработнай платы?***

— За мінулы год на новыя прадпрыемствы і вытворчасці працаўладкаваліся 56 чалавек, пры гадавым заданні ў 55 працоўных месцаў. Новыя працоўныя месцы былі створаны на прадпрыемстве «Чырвоны Мазыранін», Нараўлянскім заводзе гідраапаратуры, у Нараўлянскім спецлясгасе, саўгасе-камбінаце «Зара», у «Лесахіміку» (найбуйнейшае ў Беларусі прадпрыемства, якое займаецца здабычай і перапрацоўкай жывіцы), «Парфюмтрэйдзе», «ЗахадХімГандлі».

Таксама на тэрыторыі Нараўлянскага раёна летась зарэгістраваны шэсць камерцыйных арганізацый. Усе — у сферы вытворчасці. У кастрычніку створаны новыя працоўныя месцы ў аддзеле адукацыі спорту і турызму Нараўлянскага райвыканкама. У лістападзе зарэгістравана ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў ТАА «Усходняе зззянне». Такім чынам, план па працаўладкаванні перавыкананы.

Па выніках працы за 11 месяцаў 2017 года намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў у цэлым па раёне склала 599,5 рубля. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года яна павялічылася на 14,3 %. За лістапад склала 671,2 рубля з тэмпам росту да ўзроўню мінулага года — 129,3 %. Нараўлянскі раён па ўзроўні заробку займае 10-е месца ў Гомельскай вобласці (за студзень — верасень было 11), а сярод раёнаў сваёй падгрупы (малалікіх — Брагінскага, Кармянскага, Лоеўскага, Чачэрскага) — другое месца.

Самая высокая намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата па раёне за студзень — лістапад — у сферы фінансавай дзейнасці, вытворчасці і размеркаванні электраэнергіі, газу і вады. Самая нізкая — у такіх сферах, як творчасць, спорт, адпачынак, а таксама адукацыя.

***— Як праходзіць выбарчая кампанія ў мясцовыя Саветы дэпутатаў?***

— Выбарчая кампанія праходзіць у адпаведнасці з каляндарным планам.

Створаны раённая, чатыры сельскія і адзінаццаць участковых выбарчых камісій. Створаны 30 выбарчых акруг па выбарах у раённы Савет дэпутатаў дваццаць восьмага склікання. Сельскія выбарчыя камісіі стварылі на сваіх тэрыторыях па 11 выбарчых акруг. У тэрытарыяльных камісіях наладжана дзяжурства. Ідзе поўным ходам вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты.

У раёне робіцца ўсё неабходнае, каб выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць восьмага склікання былі праведзены на найвышэйшым арганізацыйным узроўні. Усе службы, кіраўнікі, службовыя асобы і жыхары Нараўлянскага раёна разумеюць значнасць гэтага палітычнага мерапрыемства.

***— Ужо традыцыйным стала правядзенне прамых тэлефонных ліній. З якімі пытаннямі часцей за ўсё да вас звяртаюцца грамадзяне? Наколькі хутка і эфектыўна яны вырашаюцца?***

— Выяўленне праблемных пытанняў грамадзян ажыццяўляецца падчас не толькі прамых тэлефонных ліній, але і сустрэч інфармацыйна-прапагандысцкіх груп усіх узроўняў, сходаў і прыёмаў грамадзян па асабістых пытаннях, «гарачых» ліній.

Увогуле аналіз зваротаў грамадзян паказаў, што насельніцтва раёна больш за ўсё хвалююць пытанні работы жыллёва-камунальнай службы: рамонту жылля, дарог, якасць вады, работа вулічнага асвятлення, якасць гандлёвага абслугоўвання, атрыманне адраснай дапамогі.

Усе пастаўленыя падчас правядзення прамых тэлефонных ліній пытанні выканаўцы імкнуцца вырашаць у найкарацейшыя тэрміны.

За год мной было праведзена дзевяць прамых тэлефонных ліній. Усе звароты вырашаны станоўча. Мы таксама праводзім шырокую тлумачальную работу праз СМІ сярод насельніцтва па ўсіх пытаннях, якія хвалююць грамадзян.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Нацыяналісты, якія перамаглі на Корсіцы, патрабуюць большай аўтаноміі ад Францыі

У аўторак, 2 студзеня, старшынёй выканаўчага савета Корсікі быў абраны Жыль Сімеоні, адзін з лідараў нацыяналістычнай кааліцыі «За Корсіку». Сімеоні ў якасці кіраўніка рэгіянальнага ўрада заклікаў прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона ў самым хуткім часе пачаць перагаворы аб большай аўтаноміі для вострава.

У сваім выступленні на радыёстанцыі France Inter Сімеоні заявіў, што Макрон павінен «пасласць сігнал адкрытасці» карсіканцам. Па словах кіраўніка рэгіянальнага ўрада, «дэмакратычнае падзенне» на выбарах на Корсіцы паказала, што жыхары вострава хочуць больш самастойнасці.

Пакуль што Эмануэль Макрон ніяк не выказваўся адносна будучыні Корсікі ў святле мінулых выбараў.

Нацыяналістычная кааліцыя спрабуе дамагчыся для Корсікі большай аўтаноміі, аднак, у адрозненне ад Каталоніі, там не хочуць цалкам аддзяляцца ад Францыі — не ў апошнюю чаргу з-за моцнай залежнасці вострава ад дзяржаўнага бюджэту. Апроч іншага, нацыяналісты патрабуюць раўнапраўнага прызнання карсіканскай мовы нароўні з французскай і амністыю для зняволеных, якіх яны лічаць палітычнымі.

### Маці затрабавала ад сына-дантыста 1 млн долараў за яго выхаванне і вучобу

Як пастанавіў Найвышэйшы суд Тайваня, сын павінен будзе выплаціць сваёй маці без малога 1 млн долараў за тое, што яна яго выхавала і аплаціла яго вучобу на стаматолага.

У 1997 годзе яна падпісала са сваім сынам, якому тады было 20 гадоў, кантракт, дзе было пазначана, што пасля заканчэння інстытута ён будзе плаціць ёй 60 % свайго месячнага заробку.

Пасля таго як на працягу некалькіх гадоў ён адмаўляўся гэта рабіць, жанчына падала на свайго сына ў суд.

Сын у сваю чаргу заявіў у судзе, што з маральнага пункту гледжання няправільна патрабаваць фінансавай кампенсацыі ад дзіцяці за яго выхаванне, аднак суд пастанавіў, што кантракт мае юрыдычную сілу, і прысудзіў яму выплаціць маці належнае заднім чыслом разам з працэнтамі.

### У Перу аўтобус упаў са 100-метровага абрыву



Па меншай меры 48 чалавек загінулі пры падзенні аўтобуса ў прорву ў Перу. Пра гэта са спасылкай на нацыянальную паліцыю паведамляе мясцовая газета El Comercio.

Аварыя адбылася ў раёне горада Пасамаё, на ўчастку горнай дарогі. Па адной з версій, аўтобус, у якім знаходзілася 55 пасажыраў, пасля сутыкнення з фурай зваліўся з абрыву вышынёй каля 100 метраў.

Як адзначае выданне, работа ратавальнікаў на месцы здарэння абцяжараная з-за прыліву.

# СПАРТЫЎНЫ ГОД ПАЧЫНАЕЦЦА

## Калядны турнір як сімвал старту

**Усе ўдзельнікі так званага аматарскага чэмпіянату свету па хакеі прыбылі ў Мінск і ўжо апрабавалі лёд на «Чыжоўка-Арэне». XIV Калядны турнір па хакеі на прыз Прэзідэнта Беларусі традыцыйна праходзіць у першыя дні студзеня. Восем камандаў — гэта Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, дэбютанты турніру — кітайцы, а таксама хакеісты са Швейцарыі, Расіі, Чэхіі, Швецыі, зборная Балкан і гаспадары турніру — чатыры дні будуць змагацца за ганаровы трафей.**

Першымі ў Мінск прыляцела зборная Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, менавіта з ёй беларуская каманда правядзе сваю стартавую сустрэчу. Летась госці сталі бронзавымі прызёрамі спаборніцтваў, а сёлета мэты ў іх больш чым амбіцыйныя. *«Спадзяёмся, што атрымаецца выйграць турнір,* **— адзначае Саід аль-Нуэймі, нападаючы каманды ААЭ.** *— Я вельмі натхнёны гэтым турнірам, вельмі рады зноў знаходзіцца тут чацвёрты раз. Гэта выдатныя спаборніцтвы, нам прыемна гуляць на такім узроўні, бо сюды прыязджаюць шмат былых прафесіяналаў. Для нас гэта вялікі досвед».*

Моцны склад сёлета ў чэшскіх хакеістаў, у папярэдняй заяўцы каманды пяціразовы чэмпіён свету, бронзавы прызёр Алімпіяды ў Турыне Давід Выбарны, бронзавы прызёр зімовых Гульняў у Альбервіле Радэк Тоупал і алімпійскі чэмпіён 1998 года ў Нагана, двухразовы чэмпіён свету Давід Моравец.

Нагадаем, упершыню на Калядным турніры згуляе зборная Кітая, якая выступіць на папярэдняй стадыі ў групе А са Швейцарыяй, ААЭ і хакейнай камандай Прэзідэнта Беларусі. Групу В склалі зборныя Швецыі, Чэхіі, Расіі і каманда Балкан.

Сёння турнір адкрые сустрэча хакеістаў з Кітая са швейцарцамі на малой пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны». А ў 19.00 на лёдзе вялікай пляцоўкі зборная Беларусі згуляе з камандай ААЭ.

Пераможцы груп па традыцыі 7 студзеня згуляюць за галоўны трафей турніру. Другія каманды ў квартэтах будуць змагацца за бронзавыя медалі.

Акрамя спаборніцтваў удзельнікаў і гасцей чакаюць забаўляльная і турыстычная праграмы. Прадстаўнікі камандаў 6 студзеня прымуць удзел у дабрачыннай акцыі «Калядная традыцыя» і наведаюць дзіцячы дом № 5 у Мінску. Установе ўжо пералічана дапамога ў памеры BYN25 тыс. Арганізатарамі акцыі выступаюць Прэзідэнцкі спартыўны клуб і Федэрацыя хакея Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

### РАСКЛАД ТУРНІРУ:

***4 студзеня***
*Група А:* Швейцарыя — Кітай (12.30; малая пляцоўка), Беларусь — ААЭ (19.00; вялікая пляцоўка).
*Група В:* Зборная Балкан — Расія (13.00; вялікая пляцоўка), Швецыя — Чэхія (19.30; малая пляцоўка).
***5 студзеня***
*Група А:* Швейцарыя — ААЭ (12.30; малая пляцоўка), Беларусь — Кітай (19.00; вялікая пляцоўка).
*Група В:* Чэхія — Зборная Балкан (14.00; вялікая пляцоўка), Швецыя — Расія (19.30; малая пляцоўка).
***6 студзеня***
*Група А:* Кітай — ААЭ (13.00; вялікая пляцоўка), Беларусь — Швейцарыя (19.00; вялікая пляцоўка).
*Група В:* Швецыя — Зборная Балкан (12.30; малая пляцоўка), Чэхія — Расія (19.30; малая пляцоўка).
**7 студзеня**
Матч за 3-е месца (13.00). Фінал (18.00).

■ Кампетэнтна

# ПАКУЛЬ ТОЛЬКІ РЭКАМЕНДАЦЫІ

## Аб тэрмінах з'яўлення «пасведчання суайчынніка» гаварыць рана

**Такое меркаванне выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый ВАРАНЕЦКІ. Днямі дэпутаты прапанавалі ўвесці «пасведчанне суайчынніка» — дакумент для тых выхадцаў з Беларусі, якія жывуць за мяжой, і іх нашчадкаў.**



— Паўгода ці год? Пра гэта рана гаварыць, таму што ў гэтым пытанні павінен быць дасягнуты нейкі кансэнсус. Я хачу яшчэ раз падкрэсліць, што гэта рэкамендацыі камісіі, якія мы накіравалі ўраду, зацікаўленым міністэрствам, — адзначыў дэпутат. — І я думаю, што абмеркаванне, якое сёння ідзе, і цікавасць да гэтай прапановы кажуць пра тое, што сама ідэя запатрабавана. У цэлым грамадства да такога гатова, аб гэтым размаўляюць. Мне здаецца, гэта залог таго, што пазітыўныя рашэнні ў гэтых адносінах будуць прыняты.

Валерый Варанецкі таксама адзначыў, што не варта рабіць акцэнт на прэферэнцыях для ўладальнікаў пасведчанняў.

— У нашых рэкамендацыях сказана, што ідэя — умацаванне духоўнай сувязі з гістарычнай радзімай. Людзі павінны ведаць, што іх бацькаўшчына памятае і ведае пра іх, гатовая да цеснага ўзаемадзеяння ў інтарэсах і самой Беларусі, і выхадцаў з нашай краіны, — дадаў дэпутат.

Дарэчы, гаворка ідзе не толькі пра дыяспару за мяжой, але і пра тых людзей, чые далёкія продкі жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Што да ўзаемадзеяння, то ёсць розныя варыянты, аднак формы супрацоўніцтва могуць прапаноўваць і самі беларусы за мяжой, упэўнены парламентарый.

— Дзе б гэтыя людзі ні пражывалі, яны павінны ведаць, што ёсць бацькоўскі дом, яго дзверы адчыненыя, яны тут жаданыя госці і ім будуць прапанаваны любыя магчымасці для самарэалізацыі — гэта праекты ў галіне культуры, эканомікі, экалогіі, сацыяльнай сферы, палітыкі, — адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Літаратурныя сувязі

# ПІСЬМЕННІКАЎ СВЕТУ СУСТРАКАЕ МІНСК

**У лютым у сталіцы нашай краіны адбудзецца Міжнародны сімпозіум «Пісьменнік і час».**

Разам збяруцца паэты, празаікі, публіцысты, перакладчыкі больш як з дваццаці краін свету: Азербайджана, Арменіі, Венгрыі, Вялікабрытаніі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Пакістана, Польшчы, Расіі, Румыніі, Сербіі, Славакіі, Таджыкістана, Украіны, Чарнагорыі, Эстоніі... У час работы форуму будуць абмеркаваны самыя розныя пытанні, звязаныя з міжнароднымі літаратурнымі стасункамі, станам мастацкага перакладу ў розных краінах, выпускам літаратурна-мастацкай перыёдыкі.

— Несумненна, пойдзе размова пра адносіны пісьменніка і грамадства, месца мастакоў слова ў барацьбе за мір у няпростых сённяшніх умовах, — гаворыць **намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей ЧАРОТА.**

Выдавецкі дом «Звязда» разам з Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і выдавецтвам «Мастацкая літаратура» выступае заснавальнікам, арганізатарам гэтага праекта. Да міжнароднага сімпозіума, які пройдзе 8—9 лютага, прымеркаваны цэлы шэраг кніжных праектаў, звязаных з прадстаўленнем замежных літаратур на беларускай мове. У выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыць свет анталогія кітайскай паэзіі ХХ стагоддзя. Прадоўжыцца выпуск кніг у серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая». Чарговы зборнік прадставіць творчасць Вэнь Ідо. Выйдзе кніга сучаснай сербскай прозы на беларускай мове. Перакладчык — вядомы ў краіне сербіст прафесар Іван Чарота. Будуць рэалізаваны і іншыя праекты.

**Сяргей ШЫЧКО.**
*shychko@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# Беларуска ўзначаліла сусветны рэйтынг у шашках

**Міжнародны гросмайстар Вольга ФЕДАРОВІЧ дамаглася такой вяршыні ўпершыню і для сябе, і для нашай краіны.**

На 1 студзеня яе рэйтынг быў роўны 2237, што адпавядае першаму месцу агульнага заліку. Другое месца заняла таксама былая беларуская спартсменка — 16-разовая чэмпіёнка свету, якая сёння прадстаўляе Латвію, — Зоя Голубева (Садоўская) з рэйтынгам 2231, трэцяй у топ-10 значыцца Вікторыя Матрычка з Украіны.

Адзначым, што першыя тры радкі мужчынскага рэйтынга застаюцца за спартсменамі з Расіі.

**Яўген САЛАНОВІЧ,**
**майстар спорту па шашках-100**

■ Быць на вышыні

# ЁСЦЬ ТРОХМІЛЬЁННЫ МЕНШ ЧЫМ ЗА ГОД!

**30 снежня гадавы пасажырапаток «Белавія» ўпершыню ў гісторыі авіякампаніі дасягнуў трох мільёнаў чалавек. Па папярэдняй інфармацыі, агульная колькасць пасажыраў па выніках 2017 года арыенціровачна складзе 3 008 000 чалавек супраць 2 488 100, перавезеных у 2016-м. Усяго за 21 год працы авіякампанія перавезла 20 455 000 пасажыраў.**

Упершыню за ўвесь час працы авіякампаніі было перавезена тры мільёны чалавек менш чым за год. Ужо ў жніўні «Белавія» перасягнула мяжу ў два мільёны перавезеных пасажыраў.

У аэрапорце адбылася ўрачыстая сустрэча трохмільённага пасажыра — ім стала 12-гадовая Паліна Захарчанка з Гомеля. Падарожніца разам з мамай і бабуляй адправілася сустракаць Новы год у Калінінград. Юбілейнаму пасажыру ўручылі iPad, мадэль самалёта, сувеніры ад авіякампаніі, а таксама сертыфікат на 25 000 балаў праграмы лаяльнасці «Белавія Лідар» на афармленне бясплатных білетаў па адным з кірункаў маршрутнай сеткі «Белавія».

Рост пасажырапатоку стаў магчымы дзякуючы развіццю маршрутнай сеткі, павелічэнню частаты рэйсаў і колькасці транзітных пасажыраў. Таксама павелічэнне колькасці кліентаў авіякампаніі забяспечана за кошт пашырэння флоту «Белавія», набыцця новых самалётаў, а таксама планамернага пераходу на гібрыдную мадэль арганізацыі перавозак. У сярэднім тарыфы на перавозкі за год былі зніжаны на пяць працэнтаў. Максімальная колькасць пералётаў, здзейсненых адным пасажырам на працягу года, які часта лятае, — 188 (транзітны пасажыр), сярод прамых пасажыраў — 134 разы. Штодня авіякампанія ў сярэднім перавозіць 8 200 пасажыраў.

Самымі папулярнымі напрамкамі летась сталі Масква, Кіеў, Прага, Амстэрдам, Тэль-Авіў, Тбілісі і Батумі. У 2017 годзе былі аднаўленыя рэгулярныя палёты з Мінска ў Ерэван і Ніжні Ноўгарад, павялічыліся колькасць рэйсаў у Парыж, Батумі, Алматы, Кіеў, Адэсу і Ашхабад. У 2018 годзе плануецца далейшае пашырэнне карты палётаў і набыццё новых самалётаў у завода-вытворцы (Embraer).

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# АРЫФМЕТЫКА АДУКАЦЫІ

## Новыя межы — для фінансавых эксперыментаў

**Пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе пашыраны. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 27 снежня 2017 года № 1009.**

У 2018 годзе да праекта далучаюцца ўсе ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ў Мінску і ў Жабінкаўскім раёне. Такім чынам у эксперыменце будуць удзельнічаць ужо 857 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і 471 тысяча навучэнцаў (у 2017 годзе было 642 установы і 292,1 тысячы навучэнцаў).

У рамках эксперымента аб'ёмы фінансавання, што накіроўваюцца на навучанне і выхаванне, «прывязваюцца» да колькасці навучэнцаў. Новы механізм прадугледжвае фарміраванне бюджэту ўстановы на падставе сярэднегадавых паказчыкаў колькасці навучэнцаў розных катэгорый (па ступенях навучання, колькасці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і колькасці вучняў, якія наведваюць групы падоўжанага дня), нарматыву бюджэтнай забяспечанасці выдаткаў і карэктуючых каэфіцыентаў. Базавы нарматыў для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у гарадской мясцовасці, вызначаны ў памеры 1 401,2 руб. у год; у сельскай мясцовасці — у памеры 3 116,51 руб. у год. Такая розніца абумоўлена спецыфікай функцыянавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у сельскай мясцовасці, у прыватнасці, больш нізкай шчыльнасцю насельніцтва.

Акрамя таго, звыш аб'ёму бюджэтных сродкаў, якія прадугледжваюцца на рэалізацыю пілотнага праекта, мясцовыя Саветы дэпутатаў могуць прадугледжваць дадатковыя бюджэтныя сродкі на школы. Мяркуецца, што новы механізм забяспечыць больш рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, што ў выніку адаб'ецца і на заробках педагогаў.

Таксама **будзе працягнуты і распачаты ў 2017 годзе пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання дзяржаўных устаноў дашкольнай адукацыі** (грошы «ідуць» за выхаванцамі). Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2017 г. № 1010. Прычым праект таксама будзе пашыраны. Спіс устаноў дашкольнай адукацыі, якія ўдзельнічаюць у эксперыменце, дапоўніць установы Віцебска, Гомеля, Салігорска і Лідскага раёна. У праект будуць уцягнуты 392 установы дашкольнай адукацыі і 67,4 тысячы выхаванцаў.

Базавы нарматыў для ўстаноў дашкольнай адукацыі ў гарадской мясцовасці вызначаны ў аб'ёме 1 547,17 руб. у год на аднаго выхаванца, у сельскай мясцовасці — 1 929,0 руб. у год на выхаванца.

Да базавага нарматыву прымяняюцца карэктуючыя каэфіцыенты, якія дазваляюць улічваць час знаходжання выхаванца ва ўстанове дашкольнай адукацыі, спецыфіку рэалізацыі адукацыйных праграм для розных відаў устаноў дашкольнай адукацыі і розных катэгорый выхаванцаў, у тым ліку выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, выхаванцаў, якія наведваюць санаторныя групы, пункты карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, басейны.

Укараненне нарматыўных метадаў фінансавання накіравана на павышэнне эфектыўнасці работы ўстаноў адукацыі. Сродкі, атрыманыя па нарматыве ў залежнасці ад колькасці выхаванцаў, не падлягаюць скарачэнню пры правядзенні ўстановамі аптымізацыйных мерапрыемстваў. Нарматыўнае фінансаванне спрыяе таксама замацаванню аб'ёмаў фінансавання адукацыі.

Асноўныя пункты абодвух дакументаў уступаюць у сілу з 1 студзеня 2018 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# КАПЕЙКА ТАЛЕР БЕРАЖЭ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Самая папулярная крыптавалюта — гэта біткойн. Яго асаблівасць заключаецца ў тым, што ён дэцэнтралізаваны, яго ніхто не кантралюе. Стваральнікам біткойна лічыцца Сатошы Накамота, але да гэтага часу невядома, што гэта за чалавек. Сёння біткойн каштуе больш за 13 тысяч долараў, аднак курс мяняецца штодня, што паказвае яго важную рысу — частую змену кошту.

Стваральнікі беларускай крыптавалюты, якая атрымала назву талер, — гэта журналіст Дзяніс Лаўнікевіч і IT-менеджар Сяргей Лаўрыненка. Па словах Дзяніса, ён доўгі час самастойна вывучаў тэхналогію блокчэйн і думаў пра тое, як гэта можна выкарыстаць у беларускай практыцы. У ліпені 2017 года ён зразумеў, што гэтыя веды трэба неяк прымяніць, каб «застацца ў рэчышчы сусветных тэндэнцый». Аднак журналісту для рэалізацыі амбіцыйнага плана не ставала тэхнічнай кампетэнцыі, таму ён звярнуўся да Сяргея. Такім чынам і склалася аснова каманды, якую пазней папоўнілі праграмісты, вэб-дызайнеры і менеджары.

«Дзень нараджэння» талера — 13 верасня, калі прайшла першая транзакцыя паміж электроннымі кашалькамі яго стваральнікаў. Некалькі тыдняў пасля гэтага праходзіла актыўнае тэсціраванне, выпраўляліся памылкі, а 6 кастрычніка з'явілася першая інфармацыя аб талеры ў інтэрнэце, запусціўся сайт. Стваральнікі не выкарыстоўвалі нейкі новы механізм працы, тэхналогія агульнадаступная.

Распрацоўшчыкі зрабілі акцэнт на тым, што талер — гэта зусім не замена беларускаму рублю. Хутчэй, гэта дадатковы эканамічны інструмент, які можа быць задзейнічаны ў розных бізнесах. Дарэчы, пэўную суму талераў стваральнікі раздаюць бізнесменам, якія гатовыя ў той ці іншай форме выкарыстоўваць гэтую валюту ў назапашвальных ці бонусных сістэмах. «Праект рэалізоўваўся намі за ўласныя сродкі, нашымі намаганнямі і нервамі, — адзначыў Дзяніс Лаўнікевіч. — Напэўна, галоўная ідэя заключаецца ў тым, каб Беларусь не адстала ад сусветных тэндэнцый».



Колькі ж зараз каштуе адзін талер? Па словах аўтараў, яго курс за апошнія некалькі тыдняў вырас з некалькіх цэнтаў амаль да аднаго долара. Рост адбыўся вельмі хутка. Гэта звязана з тым, што агульная колькасць талераў, якія наогул могуць быць выпушчаныя, — 23 мільёны 333 тысячы. «Ёсць ліміт, абмежаваны матэматычнай формулай, якая ляжыць у аснове алгарытму талера. Дарэчы, некаторая частка талераў ужо страчана, што непазбежна. Таму ён будзе толькі даражэць, гэта незваротны працэс», — дадаў Дзяніс Лаўнікевіч.

Важны момант — распрацоўшчыкі талера не ўплываюць на яго курс. Сёння першая беларуская крыптавалюта можа страціць да 50 % кошту за дзень. Акрамя таго, яны параілі людзям, якія прафесійна не інвестуюць у крыптавалюты, не ўкладвацца ў талер. Кантраляваць працэс фарміравання кошту немагчыма, прызналіся аўтары.

Дарэчы, агульны кошт усіх выпушчаных талераў — каля мільёна долараў.

Што будзе адбывацца з талерам далей? У найбліжэйшы час будзе запушчана адкрытая дошка, у якой будуць сфарміраваны тэхнічныя задачы. Канцэпцыя такая: любы чалавек зможа ўзяцца за задачу, а пры яе паспяховым выкананні атрымае за гэта ўзнагароджанне. Стваральнікі не плануюць зарабляць на талеры, яны хочуць паказаць свае кампетэнцыі ў гэтай сферы. Калі праект акажацца паспяховым, то гэта будзе пацвярджэннем уменняў і навыкаў, упэўнены аўтары.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

❍ У тэму

### БІТКОЙН ПАЧАЎ 2018 ГОД З ПАДЗЕННЯ КОШТУ

**І гэта адбылося ўпершыню з 2015-га — у апошнія гады самая папулярная крыптавалюта дэманстравала толькі станоўчую дынаміку ў навагоднія святы, паведаміла «РИА Новости».**



Як праінфармаваў партал CoinMarketCap, раніцай 2 студзеня біткойн патаннеў да 13,5 тысячы долараў, зафіксавана падзенне на 3,08 працэнта. На біржы Bitfinex ён знізіўся да 13,22 тысячы долараў (уніз на 4,43 працэнта). На GDAX біткойн знізіўся да 13,35 тысячы долараў, а на партале Coindesk — да 13,32 тысячы долараў, падзенне на 0,97 працэнта і 0,71 працэнта адпаведна.

Па выніках першага дня новага года кошт біткойна знізіўся на 3 %, тады як роўна год таму быў зафіксаваны рост на 3,6 %. Нагадаем, што да снежня цана на самую папулярную крыптавалюту была не вышэйшая за 10 тысяч долараў, а 18 снежня дасягнула піку — 19,511 долараў. Па выніках года біткойн падаражэў у 14 разоў.

Дарэчы, капіталізацыя рынку крыптавалют складае 627,88 мільярда долараў, з якіх больш за трэць прыходзіцца на біткойн.

Трэба адзначыць, што меркаванні наконт крыптавалют адрозніваюцца. Напрыклад, старшыня праўлення Банка развіцця Беларусі Сяргей Румас настроены даволі скептычна: «Калі разглядаць як сродак інвестыцый — гэта мадэрнізаваная МММ. Першыя, што ўклалі сродкі, — заробяць, але многія страцяць».

# ШТРАФЫ КАРАЮЦЬ СЯМ'Ю, А НЕ ТЫРАНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Скасаваць шлюб таксама часта бывае немагчыма. Суддзі нярэдка адмаўляюцца даваць развод цяжарным і маці з дзецьмі да трох гадоў, калі на гэта няма згоды мужа.

— У законе прапісана, што скасаваць шлюб у такіх абставінах нельга пры ўмове, што сужэнец ажыццяўляе бацькоўскі клопат аб дзіцяці, — заўважае Лілія Воліна. — У нас была кліентка, чый муж ніколі не заставаўся з малым, каб яна не магла выйсці з дому. Пра які клопат тут можа ісці размова? Абавязковы трохмесячны тэрмін для прымірэння пры разводзе ў сітуацыях хатняга гвалту таксама з'яўляецца бар'ерам. Мы павінны імкнуцца не захаваць сям'ю, а наадварот хутчэй раз'яднаць агрэсара і пацярпелую.

Часта па дапамогу звяртаюцца сваякі і блізкія сябры ахвяры, якія просяць умяшацца. Але, кажа **генеральны сакратар Беларускай асацыяцыі маладых хрысціянскіх жанчын Вольга ЯНЧУК**, няма заканадаўчых інструментаў, каб у такім выпадку распачаць справу — заявіць пра гвалт у сям'і павінна сама пацярпелая. Хоць у іншых краінах пра крызісную сітуацыю могуць паведаміць і суседзі, і медыкі, і гэтага будзе дастаткова, каб запусціць працэдуру па абароне жанчыны.

Чаму самі ахвяры не спяшаюцца пісаць заявы ў міліцыю? Справа ў тым, што ў якасці меры пакарання агрэсара звычайна выкарыстоўваецца штраф (а не адміністрацыйны арышт, напрыклад). А гэта — сямейны бюджэт. Грошы не караюць вінаўніка, а яшчэ горш адбіваюцца на становішчы сям'і. І наступны раз жанчына яшчэ падумае, ці варта выклікаць праваахоўнікаў. Для параўнання: за мяжой агрэсара часцей прыцягваюць да грамадскіх работ — і ён нясе адказнасць за ўчыненае, і сям'я не пакутуе.



### Пастаноўка на ўлік дадае праблем

**Ганна КОРШУН, кіраўніца агульнанацыянальнай гарачай лініі 8-801-100-8-801 для пацярпелых ад хатняга гвалту**, успамінае, што некалькі гадоў таму дзесьці 85 працэнтаў скаргаў, якія паступалі да іх, былі звязаны з неправамерным дзеяннем ці бяздзеяннем супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Міліцыя займала бок агрэсара, абараняла іх.

— На шчасце, цяпер сітуацыя заўважна змянілася. На сёння МУС — адно з прагрэсіўных ведамстваў, якое займаецца гэтай праблемай. Яны ініцыявалі распрацоўку законапраекта аб хатнім гвалце, бо ім таксама складана працаваць з крызіснымі выпадкамі. Калі інспектары выязджаюць па фактах сямейна-бытавых скандалаў, пацярпелая піша заяву, а праз час яе забірае. Яны пачынаюць абясцэньваць сваю работу, — кажа Ганна Коршун.

Адзін з самых дзейсных метадаў для барацьбы з агрэсарам — ахоўнае прадпісанне. Яно абавязвае мужчыну пакінуць агульнае з пацярпелай жыллё на тэрмін да 30 дзён, а таксама забараняе кантактаваць з ахвярай. Але прадпісанне можа быць прыменена толькі пасля паўторнага правапарушэння на працягу года.

Эксперты звяртаюць увагу на яшчэ адзін момант — пастаноўка сям'і на ўлік часам выклікае больш праблем, чым вырашае. Напрыклад, калі да жанчыны, чые дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, прыходзяць праверыць умовы пражывання, то патрабуюць ад яе характарыстыку з месца работы.

— Так, для акта абследавання патрэбны звесткі аб бацьках, але гэта абмяжоўваецца інфармацыяй пра месца работы і даход. Пры гэтым, калі жанчына не прыносіць характарыстыку, органы апекі самі робяць запыт. Адна з кліентак, якая звярталася да нас, працавала па дагаворы падраду. І кожныя тры-чатыры месяцы ёй даводзілася мяняць работадаўцу, бо наймальнікі, калі даведваліся пра яе сямейную сітуацыю, не перазаключалі кантракт, — дзеліцца Лілія Воліна.

— У нас на лініі кожная другая жанчына з непаўналетнімі дзецьмі кажа, што баіцца звяртацца ў міліцыю, бо тады сям'ю пастаявяць на ўлік. Калі дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, пры змене месца жыхарства іх складана ўладкаваць у новы садок ці школу. Малых не бяруць, нягледзячы на наяўнасць месцаў, бо ўстановам адукацыі не патрэбна дрэнная статыстыка, — уздымае праблему Ганна Коршун. — Акрамя таго, пастаноўка на ўлік спрыяе распаўсюджванню канфідэнцыйнай інфармацыі аб сітуацыі ў сям'і. Адна жанчына расказвала, як прывяла дзіця да педыятра. У паліклініцы доўга шукалі картку, а потым спыталі: малы — у сацыяльна небяспечным становішчы? «Дык ваша картка асобна стаіць!» — гучна аб'явіла медрэгістратар. І ўсе ў чарзе пачалі перашэптвацца. Так жанчына атрымлівае другасную траўматызацыю.

Сам факт пагрозы пастаноўкі дзяцей на ўлік з'яўляецца сродкам маніпуляцыі з боку агрэсара. За мяжой да статусу «знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы» іншы падыход. У Вялікабрытаніі сям'я можа трапіць у лік праблемных, калі сацыяльныя службы і паліцыя бачаць, што там ёсць хатні гвалт, а жанчына не звяртаецца па дапамогу. Або калі агрэсар парушае абароннае прадпісанне і не наведвае карэкцыйную праграму. Такая практыка больш улічвае інтарэсы пацярпелай і яе дзяцей.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Нелюдзі

## І ЗАГАДАЎ ЖОНЦЫ... ПАВЕСІЦЦА

Жахлівая гісторыя здарылася ў Бабруйску. На глебе рэўнасці 28-гадовы мясцовы жыхар дазволіў сабе здзекі над маладой жонкай, якія па жорсткасці не саступаюць фашысцкім. На працягу ночы з 22.00 да 06.00 раніцы ён перыядычна яе збіваў, душыў падушкай, а потым наогул вырашыў павесіць. Зрабіў у туалеце з электрычнага шнура пятлю, паставіў зэдлік і загадаў жанчыне здзейсніць самагубства. Знясіленая ад здзекаў ахвяра з адчаю прасунула галаву ў пятлю і ступіла з зэдліка. Але шнур абарваўся. Яе карнік склаў провад удвая і прымусіў жанчыну паўтарыць смяротны крок. Калі пятля зацягнулася на яе шыі, мучыцель абарваў шнур. Жанчына некаторы час была без прытомнасці, але засталася жывая.

У судзе пацярпелая растлумачыла, што пагрозу забойствам успрыняла як рэальную, бо мужчына вёў сябе неадэкватна. І каб здзекі хутчэй скончыліся, пагадзілася на самагубства.

Як паведаміла **старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці Алена ШУМЕЙКА**, абвінавачаны прызнаны вінаватым у пагрозе забойствам, сістэматычным нанясенні пабояў, давядзенні жонкі да замаху на самагубства. Жанчына знаходзілася ў дэкрэтным водпуску і матэрыяльна залежала ад чалавека, які ледзь не забіў яе. Суд Бабруйскага раёна і Бабруйска прысудзіў абвінавачванага да двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ва ўмовах агульнага рэжыму (частка 2 артыкулаў 145, 154, 186 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь — катаванне, пагроза забойствам, давядзенне да замаху на самагубства).

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
4 СТУДЗЕНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№1 (15832)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Дар'я ТРЫГАЛАС:
# «Узрост у тэнісе — не перашкода»



**Яна — адна з маладых і самых перспектыўных беларускіх спартсменак сярод гульцоў у настольны тэніс. У нацыянальную зборную трапіла ў 15, калі там выступалі вопытныя Вікторыя Паўловіч і Аляксандра Прывалава. Але Дар'я Трыгалас не стала іх ценем, а навязала добрую канкурэнцыю. Сёння дзяўчыне 18, за яе плячыма п'едэсталы шматлікіх міжнародных турніраў і гульні за зборную краіны. Як праходзіць звычайны дзень тэнісісткі, ці даводзіцца чымсьці ахвяраваць з-за рэжыму і што самае галоўнае ў гэтым відзе спорту, Дар'я Трыгалас расказала ў сваім інтэрв'ю.**

***— Вы трапілі ў зборную краіны ў досыць юным узросце...***

— Для настольнага тэніса гэта нармальна. На той момант была самай маладой у камандзе. Вераніка Уладзіміраўна Паўловіч тады ўжо трэніравала, а Вікторыя Паўловіч якраз пайшла ў дэкрэт. Нягледзячы на высокія дасягненні гэтых спартсменак, яны прынялі мяне добразычліва, і атмасфера ў нас у калектыве была добрая. Да таго ж у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі, дзе я трэніруюся, і на спаборніцтвах мы перасякаліся з дзяўчатамі і раней, таму ўжо былі знаёмыя.

Тады, у 15 гадоў, ужо разумела, што трапіць у зборную — гэта вельмі крута. Проста трэніравалася, максімальна выкладвалася, імкнулася павышаць свой узровень і рабіла ўсё, што магла.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Карысны досвед

# МАЗАІЧНАЯ АМЕРЫКА

## Гісторыі маладых людзей, якія наведалі ЗША па студэнцкай праграме

**Паглядзець краіну, гэты «свет у свеце», імкнуцца многія, хоць амерыканскі рытм жыцця і патрабуе шмат энергіі і амбіцый. Самая папулярная праграма, якая дазваляе студэнтам папрацаваць і адпачыць там, — Work and Travel. Яна прадугледжвае тэрмін працы да чатырох месяцаў, пасля чаго ўдзельніку даецца да 30 дзён на падарожжа па краіне. Беларускія студэнты актыўна выкарыстоўваюць гэтую магчымасць. Мы пагутарылі з трыма студэнтамі і спыталі, чым здзівіла іх Амерыка і ці знайшлі яны там пацвярджэнне распаўсюджаным у нас стэрэатыпам.**

* * *

Алеся Нікіфарава была ў ЗША два гады таму. Да гэтага дзяўчына «жыла на кефіры», падпрацоўвала ў Беларусі дзе толькі можна, каб сабраць грошай на сваю мару (паездка тады каштавала 1,4 тысячы долараў без уліку білетаў і візы).

Праграмны маршрут студэнтаў звычайна праходзіць праз Чыкага або Нью-Ёрк. Спачатку Алеся паляцела ў Чыкага.

— Горад мне здаўся «дзіка дзікім»! — згадвае Алеся. — Яго музыка — гэта выццё сірэн паліцэйскіх і медыцынскіх машын. Калі я шпацыравала па спальных раёнах, у адным з кварталаў да мяне падышоў мужчына і спытаў: «Ты разумееш, што я магу цябе забіць?» З таго часу я гуляла толькі ў цэнтры.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)***



Алеся Нікіфарава ў Маямі.

Гэта — мы

# Актыўна жыць не забароніш!

## Малады спецыяліст дапамагае адраджаць у Хоцімску культурнае жыццё



Галоўнае — творчы настрой.

**Юра ПАХОМАЎ пакуль толькі педагог-арганізатар у адной з хоцімскіх школ. Але ў яго ёсць дыплом рэжысёра, атрыманы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, і жаданне цалкам рэалізаваць свой творчы патэнцыял. У маленькім райцэнтры няма тэатраў і канцэртных залаў, але гэта не перашкаджае яму плённа працаваць па сваёй спецыяльнасці. У вольны ад асноўнай працы час ён вучыць дзяцей азам тэатральнага мастацтва і актыўна рыхтуе каманды на конкурсы вясёлых і знаходлівых. Заадно працягвае развіваць свой дызайнерскі талент. Нядаўна вось прыехаў з Кіева, куды яго запрасілі ў якасці члена журы на адзін з прэстыжных украінскіх конкурсаў прыгажосці. Пры чым тут конкурс прыгажосці? Ну пра гэта ў двух словах не раскажаш. Трэба пазнаёміцца з Юрам бліжэй. Таму ідзем да яго ў госці.**

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

У новым фармаце

# АДУКАЦЫЯ НА АДЛЕГЛАСЦІ,



## ці Падводныя камяні анлайн-навучання

**Ёсць меркаванне, што праз 10—15 гадоў анлайн-навучанне (як мінімум на ўзроўнях вышэйшай і дадатковай адукацыі) стане дамінаваць, а забяспечваць адукацыйны працэс ва ўмовах усеагульнай глабалізацыі будуць усяго некалькі сотняў (максімум — тысяч) універсітэтаў.**

У Злучаных Штатах Амерыкі, краінах Заходняй Еўропы, Паўднёва-Усходняй Азіі, а з нядаўняга часу і ў Расіі даволі выразна акрэслілася новая тэндэнцыя — кааперацыя вядучых ВНУ для аб'яднання электроннага кантэнту і пераход да канцэпцыі адкрытага навучання. У чым яе сутнасць? Адкрытая адукацыя даступная фактычна любому ахвотнаму: яна выкарыстоўвае тэхналогіі і методыкі навучання на адлегласці і забяспечвае навучанне ў зручным рэжыме. Па сутнасці, рэалізуе патрэбы асобы ў бесперапыннай адукацыі, якія дыктуюцца сучасным грамадствам. Як правіла, адкрытая адукацыя развіваецца кансорцыумамі навучальных устаноў. Напрыклад, слухачамі вядомага праекта ў сферы масавай анлайн-адукацыі Coursera з'яўляюцца больш як 10 мільёнаў чалавек, якія вывучаюць каля 1000 курсаў ад больш чым 100 універсітэтаў. Сярод іх Стэнфард, Прынстан, Мічыганскі і Пенсільванскі універсітэты. Фактычна сёння ідзе барацьба за «месца пад сонцам». Хто праз дзясятак гадоў застанецца дзеючым гульцом на рынку адукацыйных паслуг, а хто будзе вымушаны саступіць сваё месца іншым?

### Новыя магчымасці

Інфарматызацыя навучальнага працэсу і праблемы, што ўзнікаюць на шляху асваення інавацыйных адукацыйных тэхналогій, аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў **юбілейнай X Міжнароднай канферэнцыі «Дыстанцыйнае навучанне — адукацыйнае асяроддзе XXI стагоддзя», якая прайшла ў БДУІР.** Аўтарамі і суаўтарамі дакладаў, што прагучалі на мерапрыемстве, сталі больш як 400 вучоных з 10 краін, сярод якіх Беларусь, Расія, Украіна, Германія, Нідэрланды, ЗША.

**Мінус — адсутнасць заканадаўчай магчымасці заключэння і змянення дагаворных адносін без асабістай прысутнасці ва ўніверсітэце.**

— У 2017 годзе ў нас была юбілейная дата. Пятнаццаць гадоў таму мы першыя ў краіне распачалі дыстанцыйнае навучанне. Тады па дзвюх спецыяльнасцях толькі каля 20 студэнтаў адважыліся пайсці вучыцца па новай форме. А сёння па ёй навучаюцца ўжо больш як 700 чалавек па 12 спецыяльнасцях. З іх каля 70 — гэта замежныя грамадзяне, — расказаў **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — Мы адзіная ВНУ, якая ўключае ў план прыёму дыстанцыйную форму навучання. У бягучым навучальным годзе гэта былі 150 чалавек.

Летась у БДУІР у выніку аб'яднання дзвюх формаў навучання (завочнай і дыстанцыйнай) быў створаны новы факультэт — інавацыйнай бесперапыннай адукацыі. З верасня ён пераехаў у новы навучальны корпус. У сувязі з гэтым з'явіліся і новыя тэхнічныя магчымасці: у будынку пракладзены сучасныя камп'ютарныя сеткі, абсталяваны цэнтр відэаканферэнцсувязі і цьютарскі бокс. Гэтыя нованаўвядзенні дапамаглі зрабіць працэс атрымання ведаў больш эфектыўным.

Дзякуючы цэнтру відэаканферэнцсувязі падзяліцца сваімі думкамі з удзельнікамі форуму змагла і **Эла ЗІБІЦКЕР, выпускніца МРТІ, цяпер — прэзідэнт Інстытута камп'ютарных сістэм (Computer Systems Institute, Чыкага, ЗША),** на базе якога ў 2013 годзе быў адкрыты філіял БДУІР.



Дыстанцыйнае навучанне жыхароў ЗША ва ўніверсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі з'яўляецца першым у Беларусі вопытам навучання грамадзян іншага кантынента дыстанцыйна. Яно адбываецца па дзвюх спецыяльнасцях «Праграмуемыя мабільныя сістэмы» і «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у бізнес-менеджменце)».

### Тэхналогіі плюс матывацыя

— Наша задача — падрыхтаваць спецыялістаў у мінімальна кароткія тэрміны, каб яны маглі атрымаць і фундаментальныя, і практычныя веды, але галоўны акцэнт робіцца ўсё ж такі на практыку: тут суадносіны 20 на 80 працэнтаў. Мы вырашылі, што спалучэнне вашай і нашай школ можа прынесці цікавы вынік. Ужо прайшоў час прыціркі, узгаднення вучэбных планаў, разумення, чаго мы хочам, і адбору выкладчыкаў. А ў наступным годзе чакаецца першы выпуск, — паведаміла Эла Зібіцкер. — Разам з вамі мы спрабуем стварыць асяроддзе, не абмежаванае вучэбнай аўдыторыяй. Але што заўважылі? Адна з самых вялікіх праблем анлайн-навучання — гэта абслугоўванне студэнтаў і матывацыя. Для таго каб навучацца самастойна на дыстанцыі, неабходна мець вельмі высокую самаарганізацыю і матывацыю. А каб не падтрымліваць, трэба ствараць групы людзей, аб'яднаных адным інтарэсам ці адной мэтай. Патрабуецца сацыяльная і акадэмічная інтэграцыя студэнтаў, асяроддзе павінна стымуляваць іх на вучобу, інакш яны яе кідаюць. Таму ўвогуле без жывых стасункаў нельга абысціся. Трэба арганізоўваць месцы, куды студэнты могуць хоць бы раз на тыдзень прыйсці, каб сустрэцца з выкладчыкам. Але групы павінны быць невялікія.

— Магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю дома, не ўстаючы з-за камп'ютара, асабліва радуе тых, хто марыць аб другім дыпломе, — падкрэсліве **дэкан факультэта інавацыйнай бесперапыннай адукацыі Ігар ЦЫРЭЛЬЧУК.** — Вывучаць (а адпаведна, і плаціць) трэба не за ўвесь «камплект» навучальных прадметаў, а за асобныя дысцыпліны. Напрыклад, калі вы ўжо здавалі калісьці фізіку ў іншай ВНУ, вам яе залічаць аўтаматам. Яшчэ адзін важны момант. Перад залічэннем для атрымання другой вышэйшай адукацыі дысцыпліны звяраюць і ў выпадку вялікага «недабору» могуць адправіць на ЦТ. Але толькі не ў БДУІР. Тут на факультэце інавацыйнай бесперапыннай адукацыі за навучальны год дапамогуць засвоіць і здаць патрэбныя прадметы. Калі ўсё пройдзе паспяхова, залічаць адразу на другі курс.

Акрамя таго, камп'ютар і інтэрнэт прыходзяць на дапамогу студэнтам, якія хочуць вывучаць у індывідуальным парадку асобныя дысцыпліны. На працягу месяца пасля пачатку вучобы студэнт дзённай формы навучання можа напісаць заяву аб тым, што ёсць жаданне тую ці іншую дысцыпліну вывучаць дыстанцыйна. Ці, напрыклад, студэнт плануе перавесціся з адной спецыяльнасці на іншую. Як вывучыць той прадмет, які трэба здаць дадаткова? Адказ відавочны — асвоіць яго дыстанцыйна. Ахвотных зрабіць гэта набіраецца да 800 чалавек штогод. Сярод тых, хто не супраць вучыцца на адлегласці, — студэнты дзённага аддзялення, якія па нейкіх прычынах не могуць наведваць заняткі разам з аднакурснікамі. Напрыклад, маладыя людзі ўладкоўваюцца ў кампанію сваёй мары і, калі ўзнікаюць складанасці са здачай залікаў і экзаменаў, робяць выбар на карысць працы. Мы вырашылі даць шанц маладым людзям давучыцца, асабліва гэта важна для старшакурснікаў.

### Заканадаўчыя перашкоды

І ўсё ж прарыву ў распаўсюджванні дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій у вышэйшай школе пакуль не адбываецца, таму што ён немагчымы без стварэння адпаведнай нарматыўнай прававой базы на рэспубліканскім узроўні.

— Тое, што мы робім, базіруецца на нарматыўнай прававой базе, створанай лакальна ў нашай ВНУ, — тлумачыць Міхаіл Батура. — У нас распрацаваны Палажэнне аб дыстанцыйных адукацыйных тэхналогіях у БДУІР і Палажэнне аб дыстанцыйнай форме навучання ў БДУІР, у іх, у прыватнасці, вызначаны асноўныя механізмы ўзаемадзеяння з замежнымі навучэнцамі.

**«Асяроддзе павінна стымуляваць іх на вучобу, інакш яны яе кідаюць. Таму ўвогуле без жывых стасункаў нельга абысціся».**

Так, устаноўлена, што прамежкавы кантроль і бягучая атэстацыя па вучэбнай дысцыпліне могуць ажыццяўляцца з выкарыстаннем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій пры ўмове магчымасці ідэнтыфікацыі ці аўтэнтыфікацыі асобы навучэнца і наяўнасці візуалізацыі. З 2015/2016 навучальнага года студэнтам БДУІР усіх формаў атрымання адукацыі даецца магчымасць вывучэння асобных дысцыплін з вучэбных планаў спецыяльнасцяў на выбар — традыцыйным спосабам або з выкарыстаннем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій. Гэта дазваляе павялічыць акадэмічную мабільнасць студэнтаў, дазваляе ім выбіраць найбольш кваліфікаваных выкладчыкаў, павышае канкурэнцыю сярод прафесарска-выкладчыцкага складу і, адпаведна, якасць выкладання асобных дысцыплін.

З 2017 года БДУІР перайшоў на выкарыстанне ў сістэме дыстанцыйнага навучання электронных адукацыйных рэсурсаў новага пакалення. Увесь тэарэтычны матэрыял разбіты на модулі, рэкамендаваная іх колькасць — не меншая за колькасць заліковых адзінак. Кожны модуль змяшчае як мінімум адну мультымедыя-ўстаўку (відэалекцыю, прэзентацыю, вучэбны фільм). Пасля яго прадугледжаны прамежкавы кантрольны тэст. Важна, што электронныя рэсурсы новага пакалення дазваляюць арганізаваць сеткавае навучанне, аўтаматызаваць прамежкавы і выніковы кантроль

І ўсё ж шэраг праблем нарматыўна-прававога характару, якія стрымліваюць у тым ліку і экспарт адукацыйных паслуг, патрабуюць тэрміновага вырашэння. Напрыклад, адсутнасць заканадаўчай магчымасці правядзення атэстацыі з прымяненнем інфакамунікацыйных тэхналогій вымушае навучэнцаў і студэнтаў з іншых краін прыязджаць у Мінск, каб здаць залікі і экзамены (для амерыканскага філіяла Міністэрствам адукацыі было зроблена выключэнне). А гэта нятанна, таму неабходнасць асабістага візіту нярэдка становіцца вырашальным матывам пры выбары месца (краіны) для атрымання адукацыі. Пры гэтым у Расійскай Федэрацыі такой праблемы не існуе, там атэстацыя ажыццяўляецца з прымяненнем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

**Дыстанцыйнае навучанне жыхароў ЗША ва ўніверсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі з'яўляецца першым у Беларусі вопытам навучання грамадзян іншага кантынента дыстанцыйна.**

Перашкодай становяцца жорсткія тэрміны залікова-экзаменацыйных сесій, неабходнасць прадстаўлення да абароны папяровых версій курсавых і дыпломных праектаў. У выпадку аддаленага доступу аказання адукацыйных паслуг навучэнцу даводзіцца траціць сродкі на перасылку праектаў паштовымі службамі, пры гэтым хуткасць дастаўкі карэспандэнцыі не дазваляе арганізаваць аператыўны абмен інфармацыяй паміж навучэнцамі і выкладчыкам. Між іншым, электронны дакументаабарот развіваецца ў свеце на працягу ўжо больш як трыццаці гадоў, а ў Беларусі Закон «Аб электронным дакуменце і электронным лічбавым подпісе» быў прыняты ў 2009 годзе. Вось толькі сістэма адукацыі сур'ёзна адстае ад сучасных тэндэнцый. Яшчэ адзін мінус — адсутнасць заканадаўчай магчымасці заключэння і змянення дагаворных адносін без асабістай прысутнасці ва ўніверсітэце і аплата адукацыйных паслуг з-за мяжы з вялізнымі банкаўскімі камісіямі (напрыклад, пры пераводзе грошай з ЗША камісія складае 50 долараў за адзін перавод). Аплата за навучанне ажыццяўляецца толькі праз сістэму АРІП, доступ да якой маюць толькі рэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі яшчэ не прынятая. БДУІР прапаноўваў унесці ў гэты дакумент шэраг нормаў, скіраваных на далейшае распаўсюджванне дыстанцыйнай формы навучання, павышэнне попыту на яе і пашырэнне экспарту дыстанцыйных адукацыйных паслуг, бо існуе высокая імавернасць «захраснуць» на ўзроўні мінулага стагоддзя. Ці будуць яны ўлічаны? Вядома, што дыстанцыйную форму атрымання адукацыі там прапішуць асобна, бо пакуль што яна з'яўляецца толькі відам завочнай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

*Інавацыі ў адукацыі*

# ЗДОЛЬНЫЯ ЗМЯНІЦЬ ЖЫЦЦЁ ЎЖО ЗАРАЗ

## У МІНСКУ ВЫБРАЛІ НАЙЛЕПШЫЯ МАЛАДЗЁЖНЫЯ ПРАЕКТЫ

**У сталіцы прайшоў фінал рэспубліканскага конкурсу маладзёжных праектаў: студэнты і школьнікі прапанавалі свае ідэі выкарыстання лічбавых тэхналогій у адукацыі. Усяго за перамогу ў фінале змагаліся 20 каманд, журы выбрала восем самых лепшых праектаў.**



Разнастайнасць прапанаваных ідэй уразіла нават айці-экспертаў. Так, прадстаўленыя Android-праграмы дазваляюць ператвараць хатняе заданне па замежных мовах у захапляльны квэст, вучаць чарчэнню і дапамагаюць малодшым школьнікам асвоіць работу на планшэце. А, напрыклад, Telegram-бот дапамагае настаўніку аўтаматызаваць, а значыць, хутка правесці і праверыць тэст па любым прадмеце. Уразіла таксама ўласная мадэль 3D-прынтара аднаго з вучняў сталічнай гімназіі. Аўтары найлепшых ідэй займеюць падтрымку экспертаў па прасоўванні праектаў.

— Праз 5—10 гадоў сённяшнія школьнікі і студэнты будуць вызначаць развіццё навукі і тэхналогій. Да каго яшчэ звярнуцца па ідэі будучыні, як не да іх? Да таго ж яны знутры ведаюць усе добрыя якасці і недахопы сучаснай сістэмы адукацыі і могуць падказаць, як яе палепшыць. Менавіта таму Міністэрства адукацыі лічыць сваёй найважнейшай задачай падтрымку маладых распрацоўшчыкаў і ўкараненне лічбавых тэхналогій у працэс навучання. Мы праводзім конкурс маладзёжных праектаў ужо другі раз і без ілжывай сціпласці скажу: з такой моладдзю нашу краіну чакае бліскучая «лічбавая» будучыня. Вельмі прыемна і тое, што беларускі бізнес падтрымаў ініцыятыву. Мы ўдзячныя нашым партнёрам, асабліва кампаніі МТС, за дапамогу ў арганізацыі конкурсу, — расказаў **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Мінадукацыі Павел ЛІС.**

— Будучыня — за моладдзю і тэхналогіямі. Конкурс падарыў нам мноства выдатных ідэй, якія вартыя быць рэалізаванымі. Для нас гэта не проста спаборніцтва таленавітых хлопцаў і дзяўчат, а перш за ўсё дыялог з імі, магчымасць разам з моладдзю будаваць будучыню і рабіць яе больш камфортнай, — адзначыў **кіраўнік камерцыйнага дэпартамента МТС Мікалай БУЛАШ.**

Эксперты запэўніваюць, што інавацыйныя праекты, якія прапанавалі конкурсанты, могуць змяніць наша жыццё ўжо сёння. Усяго на конкурс «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу» было пададзена больш за 100 заявак ад старшакласнікаў, навучэнцаў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў краіны ва ўзросце да 23 гадоў.

Пераможцы конкурсу «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу»:

«3D-прынтар D3D Mini» (Даніла Елісееў, Мінск, гімназія № 6);

«Пакет навучальных электронных праграм па астраноміі і геаграфіі» (Дзмітрый Каршакевіч, Мінск, Ліцэй БДУ);

«Аўтаматызаваная сістэма тэсціравання на платформе Telegram @bytest_bot» (Расціслаў Нікішын, Мінскі дзяржаўны каледж электронікі);

«Згубленыя білеты» (Андрэй Рубчэня, Уладзіслаў Лёганькі, Мінск, гімназія № 40);

«Android-праграма «Школьны памочнік» (Іван Пляцінскі, Салігорск, гімназія № 1);

«Універсальны графічны рэдактар «Colokor» (Аляксандр Мацюшонак, Караліна Барысава, Мінск, СШ № 140);

«UGMI» (Раман Дземідовіч, Дзмітрый Кулажанка, Уладзіслаў Алешка, Брэст, гімназія № 1);

«MINIQUALI» (Данііл Істомін, Аляксей Гамалій, Максім Лагвіненка, Мінск, БДУ).

Конкурс маладзёжных праектаў Міністэрства адукацыі і кампанія МТС правялі ў рамках заключанага пагаднення аб супрацоўніцтве. За час сумеснай работы партнёры рэалізавалі і мноства іншых будучых праектаў: урокі па бяспечных паводзінах у сецыве для вучняў малодшых класаў і навучальныя семінары па адказных паводзінах у інтэрнэце для настаўнікаў, IT-курсы для школьнікаў у аздараўленчым лагеры, інтэрактыўную платформу для настаўнікаў і бацькоў «Інавацыйная школа».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*




*Гісторыя і памяць*

# Партрэты ахвяр — для будучых пакаленняў

Больш як 100 работ паступіла на конкурс па гісторыі для школьнікаў і студэнтаў «Ахвяры нацызму і месцы знішчэння ў Беларусі». Яго вынікі былі падведзеныя ў канцы года ў мінскім Міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ёханэса Рау.

Штуршком да правядзення конкурсу вуснай гісторыі стала адкрыццё ў Мінску перасоўнай выстаўкі «Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць», прымеркаванай да 25-годдзя аднаўлення дыпламатычных адносін паміж Германіяй і Беларуссю. Яе стваральнікі сутыкнуліся з недахопам прапанаваных біяграфічных партрэтаў ахвяр вайны. Конкурс павінен быў матываваць школьнікаў і студэнтаў да даследавання лёсаў гэтых людзей і захавання іх гісторый для будучых пакаленняў. Магчымасці пошуку такой інфармацыі сёння і яе рэканструкцыі былі прадэманстраваны на семінарах, якія правялі ва ўсіх абласных цэнтрах рэферэнты Гістарычнай майстэрні імя Леаніда Левіна ў супрацоўніцтве з мясцовымі інстытутамі развіцця адукацыі.




Вынікам сталі больш як 100 біяграфічных партрэтаў людзей — ахвяр розных месцаў прымусовага ўтрымання і знішчэння ў перыяд фашысцкай акупацыі ў Беларусі. Удзельнікі конкурсу працавалі з фотаздымкамі і гістарычнымі дакументамі, вялі даследаванні ў бібліятэках, сямейных і публічных архівах, апытвалі сведак ваеннага часу, шраг эсэ былі дапоўнены аўдыя- і відэаматэрыяламі.

Ацэнку дасланых работ праводзіла незалежнае журы, у склад якога ўвайшлі гісторыкі і сумежныя спецыялісты з Беларусі, Украіны, Расіі і Германіі.

Лаўрэатамі першага конкурсу па вуснай гісторыі, абвешчанага Дортмундскім міжнародным адукацыйным цэнтрам і Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтрам імя Ёханэса Рау пры падтрымцы Федэральнага міністэрства замежных спраў Германіі, сталі Эдуард Хваініцкі, Аляксандр Бандзік і Віктар Шадурскі.

Дзевяцікласнік Эдуард Хваініцкі ў сваім эсэ «Помні тых, хто легендай авеяны…» аднавіў жыццёвы шлях падпольшчыцы Ларысы Каранеўскай, забітай у Трасцянцы.

Работа вучня 10 класа Аляксандра Бандзіка была прысвечана новым старонкам з гісторыі Чэрвеньскага гета. Юнак займаўся вывучэннем лёсаў малавядомых ахвяр гета, якое было створана нацыстамі ў яго родным горадзе.

Віктар Шадурскі, студэнт гістарычнага факультэта БДУ, прадставіў у рабоце пад назвай «Трагедыя маёй сям'і ў трагедыі нашага народа» вынік даследавання гісторыі сваёй сям'і, у прыватнасці тых, хто загінуў у Трасцянцы.

— Пададзеныя на конкурс эсэ хвалюючым чынам паглыбляюць нашы веды аб злачынствах, здзейсненых у перыяд германскай акупацыі Беларусі, — канстатавала **Астрыд ЗАМ, кіраўнік Дортмундскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра.** — Тым самым гэтыя работы даюць важныя імпульсы для еўрапейскай культуры памяці. Мы лічым найважнейшай задачай захоўваць памяць аб усіх ахвярах, вяртаючы ім твар.

На ўзнагароджванні пераможцаў прысутнічала Мая Крапіна, адна з апошніх, хто выжыў у Мінскім гета. Яна выказала сваю ўдзячнасць усім удзельнікам за тое, што сёння маладыя людзі занатоўваюць рэчы, якія многія пажылыя не змаглі выказаць словамі. Прадстаўнікі міжнароднага журы ўручылі лаўрэатам дыпломы і запрашэнні да ўдзелу ў сумеснай адукацыйнай паездцы ў Германію. Самыя лепшыя эсэ будуць апублікаваныя на рускай і нямецкай мовах, а таксама размешчаны ў адкрытым доступе ў электронным Архіве сведак на сайце Гістарычнай майстэрні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*У ліку найлепшых*

# АД «ПОГЛЯДУ Ў МІНУЛАЕ» ДА ГАЮЧАГА ПРЭПАРАТУ

### Адбыліся першыя абласныя этапы конкурсу «100 ідэй для Беларусі»

**Сёмы сезон рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» пакрысе выходзіць на фінішную прамую. Абласныя этапы ўжо прайшлі на Міншчыне і Гродзеншчыне, у астатніх абласцях яны адбудуцца ў найбліжэйшы час. Чым паспелі здзівіць маладыя дапытлівыя розумы на гэты раз?**

Сёлета моладзь Мінскай вобласці прапанавала на конкурс нямала праектаў у галіне медыцыны. Яскравым прыкладам можа служыць праграма Medical Diagnostics Аляксандра Вашчулы, урача Жодзінскай цэнтральнай гарадской бальніцы. Яна дазволіць звесці памылку да мінімуму, выдаючы з сотняў хвароб і сімптомаў толькі тыя, якія могуць быць у пацыента, абапіраючыся на анамнез, даныя лабараторных і інструментальных даследаванняў.

Міхаіл Заяц, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі дынамікі пестыцыдаў, кандыдат хімічных навук Інстытута аховы раслін, распрацаваў тэст, здольны на месцы хутка, дакладна і за невялікі кошт вызначаць сінтэтычныя фарбавальнікі ў вінах, соках і напоях. Тэст можа выпускацца ў выглядзе тэст-палосак, шпрыцавых фільтраў, рэактыву (раствору).

Аўтарскую распрацоўку «Велакамп'ютар з пашыранымі магчымасцямі» прэзентаваў на абласным этапе конкурсу вучань 11 класа барысаўскай гімназіі № 1 Вадзім Машніцкі. Гэта вынаходка з магчымасцямі вымярэння хуткасці, адлегласці, кіраваннем падсвятленнем і галасавым агучваннем.

Прадстаўнік Гродзенскай вобласці Вадзім Быльчынскі, майстар Слонімскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці, мадэрнізаваў лістагібачны станок, пашырыўшы яго функцыянальнасць.

Упершыню ў Беларусі распрацавана сучаснае пакрыццё з іонамі серабра для лячэння ран рознай этыялогіі. Яго аўтар, Аляксандр Глуткін, асістэнт кафедры дзіцячай хірургіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, лічыць, што гэта вынаходка нашмат паскорыць працэс гаення ран і асабліва дапаможа людзям з высокай адчувальнасцю да фармакалагічных прэпаратаў.

Максім Пуроўскі, Аляксандр Варанцоў, Аляксандр Антонаў з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы прыдумалі энергаэфектыўныя крапяжы, у якіх значна павысіліся эксплуатацыйныя характарыстыкі і паменшылася цеплааддача ў параўнанні з аналагічнымі вырабамі з металу.

Папулярызацыя і развіццё турыстычнага патэнцыялу Прынёмання знайшлі сваё адлюстраванне ў праектах «Погляд у мінулае» вучаніцы лідскай СШ № 5 Аліны Лучко, «Замкі ВКЛ на тэрыторыі Беларусі», у якім студэнтка педагагічнага факультэта Гродзенскага дзяржуніверсітэта Дар'я Швабовіч выкарыстоўвае 3D-тэхналогіі для таго, каб зазірнуць у мінулае, а таксама ў праекце «Горад Гродна для маленькага турыстаў» калектыву аўтараў — вучняў гродзенскай СШ № 11 — Уладзіміра Алёхіна, Кацярыны Клепач і Сафіі Чукічавай.

Ілья Панько з Дзятлаўскай СШ № 3 і Ягор Сокал з Навапльнянскай СШ прыдумалі займальныя камп'ютарныя гульні. Ілья прапаноўвае даведацца пра героя Вялікай Айчыннай вайны, прайшоўшы квэст «Брыгада Заслонава» да канца, а праект Ягора — «Энцыклапедыя маленькага беларуса» — скіраваны на паскарэнне працэсу навучання і павышэнне цікавасці вучняў да патрыятызму.

Нагадаем, што з гэтага года колькасць намінацый конкурсу ўзрасла з дзесяці да дваццаці. Ідэі школьнікаў, студэнтаў і маладых навукоўцаў ахопліваюць аграрную, прамысловую, сацыяльную сферы, а таксама энергазберажэнне, біяіндустрыю, хімічныя і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Нябачныя масты*

# ПА АБМЕНЕ — У КІТАЙ

## Уражанні студэнткі ад паездкі

**Ірына ДЗЕЙКАЛА, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ, была ў Паднябеснай па студэнцкім абмене. Іра выпадкова ўбачыла ва ўніверсітэце аб'яву, што адбудзецца сход наконт курсаў кітайскай мовы. Схадзіла, паслухала, натхнілася і запісалася ў групу. Спачатку было вельмі няпроста, потым стала крыху лягчэй, але ўсё ж цяжкасці прысутнічалі. «Трэба быць вельмі руплівым і цярплівым, каб вывучыць мову. А каб адправіцца вучыцца па абмене ў іншую краіну, неабходна мець яшчэ і вельмі вялікае жаданне. Але аднаго яго мала, трэба прыкладваць і нейкія намаганні, каб спраўдзіць сваю мару. Пастаянна знаходзіць новую інфармацыю, шмат чытаць, запамінаць...»**

У Кітай паехала група з пятнаццаці чалавек. Усе — студэнты БДУ. Ірына вучылася ў Хэнаньскім універсітэце. «Успрымаць інфармацыю, безумоўна, складана, таму што навучанне вялося на кітайскай мове, але мне было цікава нягледзячы на цяжкасці. Усе аднагрупнікі прыехалі з розных краін, атрымалася такая інтэрнацыянальная група», — расказвае студэнтка.

Моладзь старалася дапамагаць адно аднаму, калі нешта не атрымлівалася. Заняткі ў Хэнаньскім універсітэце доўжацца кожны дзень з 8.30 да 12.00, зусім не так, як у Беларусі. Тут у большай ступені трэба самому чытаць, самастойна вучыцца, каб нешта атрымалася.

У Кітаі Ірыне вельмі спадабалася. Дзяўчына спачатку хвалявалася, таму што трапіла ў зусім іншы свет. Але ўсё аказалася прасцей, чым здавалася на першы погляд. Іра пазнаёмілася з дзяўчынай з Расіі. Сяброўкі разам хадзілі ва ўніверсітэт, разам адпачывалі — удзвюх нашмат лягчэй.

Суразмоўніца расказвае, што кожны дзень адбывалася нешта цікавае. «Да мяне часта падыходзілі, каб сфатаграфавацца. Кітайцам цікава, адкуль мы прыехалі». Іра заўважыла, што ў Кітаі вельмі любяць расійскага спевака Вітаса. Мясцовыя жыхары часта слухаюць яго кампазіцыі, нават намагаюцца самі падпяваць.

«Кітайская ежа мне спадабалася, асабліва локшына з грыбамі і з курыцай. Адразу я ела вострыя стравы, а потым, каб зберагчы свае смакавыя рэцэптары, пачала заказваць ежу з меншай колькасцю прыпраў. Малака тут няма, таму каву пілі проста чорную. Таксама няма і звычайнага хлеба, ёсць толькі салодкі», — з доляй расчаравання канстатуе Іра.

Адной з адметнасцяў краіны з'яўляецца вялікая колькасць свят. Не паспелі беларускія студэнты прыехаць і пачаць вучобу, як неўзабаве кітайцы чатыры дні адзначалі свята Месяца, а праз тыдзень чарговыя вялікія святы расцягнуліся ўжо на дзесяць дзён. Заняткаў ва ўніверсітэце не было, таму што ў гэты перыяд у мясцовых жыхароў абавязкова заведзена падарожнічаць, каб потым расказваць, дзе ты пабываў...

«Насамрэч адрозненняў шмат, і бывае, што яны вельмі здзіўляюць, — гаворыць Іра, — але менавіта для гэтага ты тут і знаходзішся: каб вывучыць мову і з галавой акунуцца ў незнаёмую і такую непадобную да роднай культуру».

**Марына ЛЯШКЕВІЧ.**



# МАЗАІЧНАЯ АМЕРЫКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Нягледзячы на такую неспадзяванку, Чыкага не абдзяліў дзяўчыну і станоўчымі эмоцыямі.

— Вядома, трапляліся і добразычлівыя амерыканцы. Я ішла ў белвестаўскім абутку, насустрач мне амерыканец: «Хай, класныя туфлі!». Пасля гэтага мы з ім вельмі адкрыта і весела размаўлялі, хаця ён і не ведаў, што такое «Белвест»! — смяецца гераіня.

Адно з самых «ваў!»-уражанняў Алесі ад Чыкага — яго незвычайная архітэктура. Горад зляплены з рандомных кавалкаў, быццам недарэчнае дзіця збірала лега. Напрыклад, на цагляныя дамы «чапляюць» шкляныя ці бетонныя надбудовы.

Таксама дзяўчыну ўразілі хвалёныя амерыканская свабода і талерантнасць. Так, у адным з двароў яна ўбачыла пудзіла з тварам Барака Абамы з кучай дроцікаў — гэткая лялька вуду, а побач ляжалі нядбайна раскіданыя шыны...

Пасля дзяўчына паехала працаваць у гарадок Дэтройт Лэйкс (штат Мінесота). Заняткі ёй знайшлі ў прыгарадных дамах, куды амерыканцы прыязджаюць бавіць вольны час на прыродзе.

— Мы ўдваіх з такім жа студэнтам, як і я, абслугоўвалі шэсць катэджаў. Пыласосілі, раскладвалі ручнікі, запраўлялі ложкі. Працавалі па сорак гадзін у тыдзень. За гадзіну атрымлівала восем «баксаў» і нядрэнны гасцінец — у сярэднім 50 «зялёных» за тыдзень. За два месяцы зарабіла чыстымі тры тысячы долараў (жыла на чаявыя). Інакш кажучы, цалкам пакрыла выдаткі на праграму, — расказвае гераіня. — Часам мянялася з калегамі і працавала афіцыянткай. Таксама мы забаўлялі гасцей у рэстаранах — арганізоўвалі канцэрты. За адно такое мерапрыемства можна было атрымаць 600 «баксаў».

Акрамя заробку, быў яшчэ адзін карысны бонус — Алеся павысіла моўны ўзровень: пасля паездкі яна свабодна валодае англійскай, завяла знаёмствы ў розных кутках свету (дзякуючы чаму пабывала ў Турцыі і збіраецца ў Індыю). Галоўным мінусам праграмы Work and Travel дзяўчына лічыць працу ў маленькіх гарадах, калі няма магчымасці дабрацца да «цывілізацыі» і нават купіць Skittles.

На зароблены грошы Алеся злятала адпачыць у Маямі (штат Фларыда), накупіла адзення, кніг, абутку і сувеніраў, а таксама прывезла грошай бацькам.

* * *

Паша Транчонак летась тры месяцы працаваў на паўвостраве Кейп-Код (недалёка ад Бостана, штат Масачусэтс), паспеў паглядзець на жыццё ў Нью-Ёрку і Бостане.

— Калі мне агучылі кошт, быў шакаваны, таму што гэта больш за дзве тысячы долараў, уключаючы білеты на пералёт і візу. Я пазычыў грошай ва ўсёй сям'і! Кажу: «Адпусціце мяне ў Штаты, хачу паглядзець, як там людзі жывуць!» — з усмешкай згадвае юнак.



«Прыехаў!» Паша Транчонак у Бостане.

Хлопец працаваў па сем гадзін у дзень у Dunkin' Donuts — сетцы кавярняў з пончыкамі. Падымаўся ў чатыры раніцы, каб да пяці прыехаць у краму, дзе яго і іншых студэнтаў забіраў аўтобус і адвозіў за 100 кіламетраў. Цікава, што ўвесь час у дарозе аплачваўся як працоўны — дзесяць долараў за гадзіну.

— Мы ездзілі па студэнцкай візе J1 — моладзь набіралі нібыта працірацца сталы, мыць прыбіральні. Але я сказаў работадаўцам, маўляў, гэтага рабіць не буду. Яны ў адказ: што атрымліваецца, тое і рабі.

Хлопцу дазволілі падоўжыць змену — з чатырох раніцы да шасці вечара. Яму трэба было адпрацаваць пазычаныя грошы, і ўжо праз месяц ён пакрыў гэтыя выдаткі. Пачаў браць выхадныя, з'ездзіў у Нью-Ёрк, часта катаўся ў Бостан.

Студэнт акрамя працы ў кавярні паспеў асвоіць яшчэ адзін занятак — чысціў грузавыя аўтамабілі.

— Наш менталітэт дазваляе з лёгкасцю ўжыцца ў ЗША. Амерыканцы, калі вучацца, завастраюцца на адной рэчы. А мы вельмі разнабаковыя і не саромеемся работы, якую не хочуць выконваць яны, — кажа суразмоўнік.

Акрамя гэтага, хлопца ўразіла гатоўнасць амерыканцаў аказаць дапамогу. Калі Паша толькі прыехаў у Штаты, ужо на вакзале тры чалавекі, убачыўшы разгубленага замежніка, спыталі, што яму падказаць і чым яны могуць дапамагчы. Неяк юнак падвярнуў нагу, гуляючы ў футбол, і, калі гэта ўбачыў кліент кавярні Dunkin' Donuts, спытаў, што здарылася з хлопцам. Паша расказаў. Назаўтра амерыканец прынёс беларусу майку каманды «Нью-Ёрк Сіці» і даў 50 долараў гасцінца.

— Яны вельмі талерантныя. Кажуць, што ў ЗША нельга дзверы дзяўчатам прытрымліваць або саступаць месца — гэта ўсё поўная лухта! Але ў нас ты прытрымаеш у метро дзверы, яна кіўне і ўсё, а там скажа «Дзякуй, добрага дня!», — дзеліцца назіраннямі хлопец і дадае, што ў Штатах усім абыякава, як ты выглядаеш.

Падчас свайго знаходжання ў Амерыцы Паша змог зарабіць разам з чаявымі восем тысяч долараў.

**Студэнт акрамя працы ў кавярні паспеў асвоіць яшчэ адзін занятак — чысціў грузавыя аўтамабілі.**

* * *

З Янай Габелевай мы гутарылі, калі яна знаходзілася ў ЗША. Для таго каб здзейсніць сваю амерыканскую мару, дзяўчына летась зарабіла грошы, працуючы ў Германіі. Студэнтка афарміла дакументы на праграму амаль за год да паездкі, таму што так абыходзіцца танней, чым перад самым ад'ездам. Яна заплаціла тады 1140 долараў без уліку авіябілетаў і візы.



Яна Габелева *(злева)* з калегай.

Спачатку дзяўчына накіравалася ў Нью-Ёрк, потым паехала ў пасёлак Кенебанкпарт (штат Мэн). У студэнткі працаўладкаванне складвалася не так лёгка, як у папярэдніх герояў.

— Я адправіла больш за 1200 лістоў, каб мяне ўзялі на працу ў якую-небудзь кавярню. У Кенебанкпарце жыла ў катэджы, працавала ў рэстаране. Прыбірала брудныя талеркі і падносіла ежу. Мне шмат абяцалі, але многага не выканалі. Я павінна была працаваць па 40 гадзін у тыдзень, але атрымалася па 28. Таксама было сказана, што буду атрымліваць 40—80 долараў чаявых у дзень, а ў сапраўднасці выходзіла па 10—20. Я і мая сяброўка пратрымаліся на гэтым месцы толькі дзесяць дзён.

Дзяўчаты пачалі шукаць іншую працу праз «УКантакце» і «Інстаграм». Праз два дні (надта пашанцавала) беларускі адправіліся ў горад Аганквіт. Добра, што наймальнік адпусціў.

— Цяпер мы гатуем піцу. Працуем па пяць дзён у тыдзень з 11 раніцы да 12 ночы. Пашанцавала, што калектыў вясёлы, я знайшла тут шмат сяброў. Па прыездзе пачала шукаць яшчэ адну працу, бо гэтай было мала. Падпрацоўваю ў рэстаране фаст-фуду тры-чатыры дні на тыдзень...

Яна не надта ўражаная прыгажосцю ЗША і ўзроўнем жыцця. Адзінае, што яе задаволіла і натхніла, — новыя знаёмствы. Дзяўчына пасябравала з вялікай інтэрнацыянальнай кампаніяй — літоўцамі, сербамі, балгарамі, македонцамі, расіянамі і іншымі. З новымі знаёмымі Яна ездзіла па выхадных у падарожжы — паглядзець на мясцовыя славутасці.

**«Я ішла ў белвестаўскім абутку, насустрач мне амерыканец: «Хай, класныя туфлі!».**

— Наведаць Амерыку цікава, каб паглядзець, як жывуць людзі, пашырыць свой кругагляд. Тут сапраўды ўсё па-іншаму. Але я не хацела б застацца ў гэтай краіне. Калі ў мяне спытаюць, што падабаецца болей, Амерыка ці Беларусь, я адкажу абсалютна шчыра — радзіма.

Ментальнасць амерыканцаў Яну не заўсёды прыемна ўражвала.

— Калі я працавала ў піцэрыі, мне трэба было дастаць з халадзільніка цеста, якое ляжала высока. Цягнулася, як магла, але не атрымлівалася дастаць нарыхтоўку. Заходзіць высачэзны амерыканец, кажа: «Разумею, разумею!» і... выходзіць. З другога боку, шэфы нароўні з работнікамі падмяталі падлогу і гатавалі піцу, калі было шмат заказаў. Амерыка вельмі розная. Я лічу, што двух з паловай месяцаў недастаткова, каб спазнаць яе лепш.

Таксама Яну бянтэжыць, што ў жыхароў ЗША занадта папулярныя свабодныя адносіны.

— Наогул, у іх няма такой каштоўнасці, як сям'я. Дык што тады важна ў жыцці? Яны жывуць на працы, праца для іх — гэта дом. Магчыма, я мела стасункі з нямногімі амерыканцамі, але ў мяне склалася менавіта такое ўражанне.

**Дар'я СПЕВАК.** *dashaspevak@gmail.com*

## О завершении процедуры приема-передачи обязательств по договорам добровольного страхования жизни с дополнительными рисками, страховых резервов и фондов от ОАСО «Пенсионные гарантии» к РДУСП «Стравита»

В соответствии с пунктом 27 Положения о порядке передачи страховой организацией обязательств, принятых по договорам добровольного страхования, страховых резервов и остатков средств фондов предупредительных (превентивных) мероприятий другой страховой организации, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 04.11.2006 № 1462, ОАСО «Пенсионные гарантии» информирует:

Республиканское дочернее унитарное страховое предприятие «Стравита» завершило процедуру приема-передачи обязательств по договорам добровольного страхования, страховых резервов и фондов от Открытого акционерного страхового общества «Пенсионные гарантии».

РДУСП «Стравита» осуществляет страховую деятельность на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления страховой деятельности от 19.12.2003 № 02200/13-00003.

Юридический адрес: 220037, г. Минск, пер. Козлова, д. 7.

Тел./факс 8-017-245-16-99.

Дата начала исполнения обязательств Республиканским дочерним унитарным страховым предприятием «Стравита» по договорам добровольного страхования – 29.12.2017.

УНП 191027557

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| | |
|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | **7 февраля 2018 г.** в 14.00 г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 16, Мядельский сельский исполнительный комитет,<br>тел. (8-01797) 55-7-35, тел./факс (8-1797) 55-7-36<br>С момента опубликования извещения до 16.00 5 февраля 2018 г.<br>В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| Порядок осмотра земельных участков на местности | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| Условия проведения аукциона | Наличие не менее двух участников |
| Продавец | Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | Мядельский сельский исполнительный комитет: **г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15-16, тел.: (8 01797) 55-7-35, тел./факс (8 1797) 55-7-36** |
| Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе | Размер задатка: 10% от начальной цены.<br>Документы: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации.<br>Реквизиты: р/с BY54AKBB36410619001106100000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601 г. Молодечно, код AKBBBY21601, УНН 600380436, код платежа 04901 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне |
| **ЛОТ № 1** | |
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Новая, участок № 16 площадью 0,1556 га (кадастровый номер 624083103601000268).<br>**Начальная цена 27 000 (Двадцать семь тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне озера Нарочь на площади 0,1556 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Имеется возможность газификации |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 1 483 р. 66 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 823 р. 00 к.;<br>оформление градостроительного паспорта – 439 р. 36 к.;<br>государственная регистрация земельного участка – 78 р. 20 к.;<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 143 р. 10 к. |
| **ЛОТ № 2** | |
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Новая, участок № 5 площадью 0,1338 га (кадастровый номер 624083103601000262).<br>**Начальная цена 30 000 (тридцать тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне озера Нарочь на площади 0,1338 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Улица асфальтирована, имеется возможность газификации |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 2207 р. 69 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 1077 р. 10 к.;<br>оформление градостроительного паспорта – 924 р. 49 к.;<br>государственная регистрация земельного участка – 63 р.;<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 143 р. 10 к. |

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**по объекту: «Группа многоквартирных жилых домов с объектами социально-гарантированного обслуживания населения и общежитие в районе пересечения ул. Выготского, Проектируемой № 3 в г. Минске». Жилой дом № 2 по генплану.**

**Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566. **Юридический адрес**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:

– жилой дом № 20 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 40 месяцев;

– жилой дом № 12 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 24 месяца;

– жилой дом № 14 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 47 месяцев;

– жилой дом № 8 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 15 месяцев;

– жилой дом № 10 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 13 месяцев;

– жилой дом № 16 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 20 месяцев;

– жилой дом № 29 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 18 месяцев;

– жилой дом № 3А по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 7 месяцев;

– жилой дом № 7Б по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 9 месяцев;

– малоэтажные жилые дома по ул. Зацень, 45А, 45Б, 45В, фактический срок строительства – 5 месяцев;

– жилой дом № 123 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 27 месяцев;

– жилой дом № 37А по ул. Каховская, фактический срок строительства – 52 месяца;

– жилой дом № 121 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 18 месяцев;

– жилой дом № 15 по ул. Павлины Меделки, фактический срок строительства – 9 месяцев;

– жилой дом № 5 по ул. Павлины Меделки, фактический срок строительства – 10 месяцев;

– жилой дом № 20 по ул. Выготского, фактический срок строительства – 12 месяцев.

Цель строительства многоквартирного жилого дома общей площадью 8466,95 кв. м, в том числе общей площадью квартир – 6851,58 кв. м, – увеличение уровня обеспеченности населения жильем.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – август 2017 г.

Окончание строительства объекта, согласно ПОС (7,3 мес.) – март 2018 г.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 06.04.2016 г. № 74-15/16, от 06.07.2017 г. № 350-15/17.

Земельный участок передан Государственному предприятию «УКС Центрального района» решением Мингорисполкома от 16.05.2016 г. № 1343.

Получено разрешение Госстройнадзора от 04.08.2017 г., от 17.08.2017 г., от 14.11.2017 г. № 2-209Ж-021/17.

Генеральный подрядчик – ОАО «МАПИД» (договор генподряда от 27.07.2017 г. № 27.07/17).

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 6,7% общей площади жилого дома.

Объект «Группа многоквартирных жилых домов с объектами социально-гарантированного обслуживания населения и общежитие в районе пересечения ул. Выготского, Проектируемой № 3 в г. Минске». Жилой дом № 2 по генплану запроектирован 3 секционным 9-этажным. В каждой секции предусмотрен лифт, мусоропровод.

Проектом предусмотрено техническое подполье и теплый технический чердак. В техподполье предусмотрены тепловой пункт и водомерный узел. На 1-м этаже запроектирована встроенная электрощитовая. 1–9-й этажи занимают квартиры: всего – 132 квартиры, в том числе однокомнатных – 75 шт., двухкомнатных – 57 шт. Все квартиры имеют летние помещения (остекленные и неостекленные лоджии (балконы).

Конструкция здания – с применением сборных железобетонных изделий серии М464М-9. Фундаменты запроектированы сборные ленточные. Стены внутренние – сборные железобетонные панели толщиной 160 мм. Стены наружные предусмотрены в изделиях серии М464М-9 из железобетонных трехслойных панелей толщиной 350 мм с утеплением из плит полистирольных ППТПТ-35 толщ. 200 мм. Перекрытия из сборных железобетонных плит из тяжелого бетона толщиной 160 мм. Кровля плоская с внутренним водостоком, двухслойная; наклонная – металлопрофиль. Наружная отделка – фактурное покрытие защитно-декоративное стен; декоративные элементы, покрытия скатных участков кровли, козырьков, завершения лоджий – профнастил кровельный. Окна – из профилей ПВХ. Остекление лоджий из профилей ПВХ, остекление – стекло. Нижняя часть элементов остекления лоджий предусмотрена из сэндвич-панелей. В некоторых квартирах предусмотрен совмещенный санузел. Входы в жилое здание осуществляются по крыльцам, оборудованным специальной подъемной платформой для инвалидов.

Внутренняя отделка предусматривает подготовку под чистовую отделку.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается 69 квартир без выполнения внутренних отделочных работ, из которых:**

– 45 (сорок пять) 1-комнатных общей площадью от 40,35 $м^2$ до 42,28 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 820 долларам США;

– 24 (двадцать четыре) 2-комнатных общей площадью от 63,79 $м^2$ до 67,75 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 780 долларам США.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере 50% стоимости объекта долевого строительства в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Обязательство дольщика по уплате цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком на день платежа на специальный и расчетный счета застройщика.

**При подаче заявления и заключении договора с гражданином, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, необходимо** личное присутствие гражданина или его представителя, наличие паспорта и копии паспорта или доверенности и копии доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке, в которой должно быть предусмотрено право на представление интересов по всем вопросам, связанным с участием в долевом строительстве квартиры, в том числе правом подачи заявлений, справок, подписания необходимых документов.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 10 января 2018 года **по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве считается неподанным, и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента заключения договоров создания объекта долевого строительства на все количество продекларированных помещений.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел. 306-07-26.**



**Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:**

– квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ №№2264673, 2264675, 0207200-0207202, 0544612-0544613;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№0963435-0963438, 1325784, 1640658, 1455397, 1609359, 1663422, 1663258;

– полис «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) формы 2РН, 2РП серии АК №0130564;

– полис «Добровольное страхование от несчастных случаев» формы 2РН, 2РП серии НС №0038627.

УНП 100782388

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом № 3 по генплану», опубликованной в газете «Звязда» № 153 (28517) от 11.08.2017**

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – 31 мая 2018 года.

УНП 192400611

## ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**Уважаемые акционеры ОАО «Универмаг «Солигорск»!**
**«18» января 2018 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Универмаг «Солигорск», расположенного по адресу: 223710, Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 39. Собрание пройдет по адресу: г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4-й этаж, актовый зал.**

**Собрание созывается по инициативе наблюдательного совета ОАО «Универмаг «Солигорск» (протокол № 15 от 03.01.2018).**

**Повестка дня собрания:**

1. О предоставлении структурному подразделению Минского областного исполнительного комитета, уполномоченному на проведение анализа эффективности деятельности организаций, сведений и документов открытого акционерного общества «Универмаг «Солигорск» в 2018–2019 годах.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4-й этаж, кабинет «Отдел кадров» с 9 января по 17 января 2018 года в рабочие дни (время работы с 8.00 до 17.00) либо 18 января 2018 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 18 января 2018 года, 14.00.**

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на **5 января 2018 года.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**
**акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

## ИНФОРМАЦИЯ О ФОРМИРОВАНИИ РЕЕСТРА ВЛАДЕЛЬЦЕВ ЦЕННЫХ БУМАГ

Открытое акционерное общество «Универмаг «Солигорск», ул. Ленина, 39, г. Солигорск, Минская обл., 223710, информирует о формировании реестра владельцев ценных бумаг для составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров на дату 5 января 2018 года. Решение принято наблюдательным советом 3 января 2018 года.

УНН 600024725

**ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению КЖРЭУП «Сельмашевское» (продавец) извещает о проведении 19 января 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| ПРИМЕЧАНИЕ: **стоимость имущества реализуется без учета НДС (в соответствии с пп. 2.3 ст. 93 НК РБ).** Местонахождение имущества: **г. Гомель, пр-т Космонавтов,15** | | | |
| 1 | **Автомобиль специальный фургон (техпомощь) марки ГАЗ-52-3201**, 1986 г. в., **рег. № 2063 ГСМ**, цвет – голубой, тип ТС – грузовой фургон, инв. № 104053, состояние – требует ремонта | **1 335,08** | 133,51 |
| 2 | **Автомобиль МАЗ 5551, 1992 г. в., рег. № ЕС 2561**, инв. № 5025, цвет – серо-белый, тип ТС – грузовой, состояние – требует ремонта | **4 195,84** | 419,58 |

**Продавец:** КЖРЭУП «Сельмашевское», г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15. Конт. тел. 8 (0232) 22-47-07 – Селиванов Николай Адамович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (КЖРЭУП «Сельмашевское»):** р/с BY21 PJCB 3012 4045 4310 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 400, УНН 400052171, БИК PJCBBY2X, ОКПО 00642495, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 января 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 17 января 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 08.06.2017 г. № 64 (20896). Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**

SEX-БАЛЯСЫ

# ХАЙПУЮЦЬ УСЕ!

**Сёння, як вядома, калі цябе няма ў сацыяльных сетках, цябе няма ўвогуле. («Цяпер модна выглядаць як дрывасек. Які не сячэ дрэвы і цэлы дзень даглядае сам сябе, каб падабацца іншым дрывасекам».) Ты як быццам бы і не жывеш. Прынамсі, у гэтым упэўненыя іх шматлікія карыстальнікі. («Бачыў сёння чалавека без барады... Джынсы не падкасаны, татуіровак няма, скронечкі не выгалены... Халера, канешне... Відовішча не для слабанервовых».) Прычым, каб прыцягнуць да сябе ўвагу, ужо мала проста выкладваць сэлфі, фотаздымкі, напрыклад, ежы ці архітэктурных будынкаў, прыроды. Усім гэта ўжо прыелася, надакучыла. А ўвагі ж хочацца па-ранейшаму, многія ад яе па-сапраўднаму залежныя. Як жа вярнуць яе да ўласнай персоны? Трэба зрабіць нешта неардынарнае, незвычайнае, тое, што яшчэ ніхто не рабіў! Здзівіць, шакіраваць! Каб «лайкалі» з новай сілай, каб колькасць праглядаў імкліва расла! («Ён і не ўяўляў сабе, наколькі круты, пакуль не пачаў пісаць рэзюмэ».) Памятаеце, колькі гадоў таму была папулярная песня — фактычна з-за аднаго радка? «Кайфуем, сёння мы з табой кайфуем...» У мяне часам узнікае ўражанне, што я пабываў у адной са сцэн вядомай кінакамедыі, дзе Іван Васілевіч абвясціў для ўсіх прысутных на новы лад: «Танцуюць... Не, хайпуюць усе!» Бо гэты новы трэнд пераследуе многіх, як і той самы навязлівы радок з песні...**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Хайпуем, сёння мы з табой хайпуем...» У Амерыцы пара вырашыла зняць адзін з самых небяспечных ролікаў у гісторыі, каб потым пахваліцца ім у сеціве. Відэаблогеры задумалі праверыць, ці вытрымае кніга, паднесеная да грудзіны, стрэл з пісталета. Буйнакаліберная зброя, адлегласць — паўметра... «Рамантычна», праўда? Вынік заканамерны: хлопец мёртвы, дзяўчына атрымала паўгода турмы за ненаўмыснае забойства. («— Гэта я не рамантычная? А як жа ўсе гэтыя свечкі на падлозе? — Ты выклала пентаграму! — Але ж свечкамі!») У Мінску нядаўна хлопцы таксама вырашылі хайпануць водгукаў запісам сваіх прыгод. Абкруціліся цэлафанам, абліліся гаручым і падпалілі сябе... Балазе, паспелі дабегчы да Нямігі. Хоць і пацярпелі, але засталіся жывыя. («Думаць трэба галавой, кахаць сэрцам, адчуваць — «пятай кропкай». І, самае галоўнае, — нічога не пераблытаць»).

**Давайце ж у гэтыя святочныя дні «лайкнем» адзін аднаму добрым настроем! І тады...**

«Хайпуем, сёння мы з табой хайпуем...» Вось яшчэ адна гісторыя, за якой, думаецца, стаяць усё тыя ж водгукі ў сеціве. Малады дызайнер відэагульняў з Кітая прыдумаў арыгінальны спосаб, як зрабіць прапанову сваёй дзяўчыне. Ён купіў 25 смартфонаў iPhone X і выклаў з іх сэрца на фоне пунсовых пялёсткаў руж. («— Мілы, хочаш, я падару табе сваё сэрца? — Ты мне нервы вярні!») А ў цэнтры кампазіцыі знаходзілася каробачка з заручальным пярсцёнкам. Паведамлялася, што дзяўчына адказала вынаходліваму маладому чалавеку «так». Ну, якія маглі быць яшчэ варыянты пры такім раскладзе? («Мне здаецца, што самае складанае ў бадмінтоне — прыкідвацца, што табе весела».) Зыходзячы з цэн на гэтыя смартфоны ў Кітаі, будучы жаніх патраціў на іх набыццё больш за 31 тысячу долараў. («Дзяўчаты скакалі, пілі, весяліліся... Хлопцы плацілі, злавалі, мацюкаліся...») Скажаце, што ніякі я не рамантык? Тады адкажыце на адно пытанне: навошта дзяўчыне столькі тэлефонаў? Яна будзе пераменна імі карыстацца? («Адкуль у вас час на плед, кнігі, пакуты і іншыя атрыбуты дэпрэсіўнага часу? Мне, напрыклад, сёння на працу, заўтра на працу і паслязаўтра на працу».) Несумненна, тэлефоны распрададуць, яны былі патрэбныя хлопцу як антураж, які здымалі на камеру шматлікія сябры.

«Хайпуем, сёння мы з табой хайпуем...» Жыве на свеце такая дзяўчына Сафія Хаджыпантэлі, працуе мадэллю. Папулярнасць у сеціве ёй прынесла незвычайная знешнасць. У яе амаль 50 тысяч падпісчыкаў у «Інстаграме», а вядомая яна тым, што спрабуе ўвесці ў моду «монабрыво». («— Дзяўчына, я бачу, вы вельмі любіце маляваць? — А як вы здагадаліся? — Ды па брывах...») Як бы вам растлумачыць, пра што гаворка? Прыгадайце брэжнеўскія бровы — толькі як адну суцэльную, без разрыву. Атрымалася? Свае густыя светлыя бровы мадэль яшчэ і фарбуе ў цёмны колер, каб яны выглядалі яшчэ больш эфектна... («Намаляваў сабе вусы на рабоце, а жанчыны з намаляванымі брывамі вырашылі, што я дурань. Божа, дзе логіка?») Памятаеце, у фільме «Службовы раман» сакратарка Верачка вучыць Людмілу Пракоф'еўну Калугіну вышчыпваць бровы рэйсфедарам? Так, балюча, але прыгажосць патрабуе ахвяр. («Хацеў сусешыць дзяўчыну — сцёр ёй бровы».) Але можа працей абвясціць хібы знешнасці новым трэндам і хайпануць «лайкаў» заадно?

Насамрэч пасыл у прыцягненні ўвагі навакольных — не новы. Гаспадыня чуе добрыя водгукі дамашніх, калі, напрыклад, прыгатуе смачную страву. А падзеліцца рэцэптам — пашырыць аўдыторыю «падпісчыкаў». Толькі ў гэтых выпадках усё па-добраму, без агрэсіі і паказухі. («Ішоў учора дадому, бачу, некалькі надпісаў на асфальце па парадку: «Ты маё сонейка», «Я цябе кахаю», «Прыгатуй мне боршч і катлеткі, калі ласка». І ведаеце, што? Я прыйшоў дадому, жонка сустрэла мяне баршчом і катлеткамі. Пайшоў да суседа расказаць, а ў яго дома тыя ж стравы. Мужык, што гэта напісаў, паважаем цябе ўсёй мужчынскай паловай нашага дома!») Давайце ж у гэтыя святочныя дні «лайкнем» адзін аднаму добрым настроем! І тады... Кайфуем, сёння разам мы кайфуем!..

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Узрост у тэнісе — не перашкода»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Цяпер зборная Беларусі — гэта сплаў вопыту і маладосці?***

— Так, Аляксандра Прывалава і Вікторыя Паўловіч больш дасведчаныя, астатнія дзяўчаты маладыя. Але мы стараемся падцягвацца да лідараў, таму ў нас у камандзе добрая, здаровая канкурэнцыя.

***— Вы з дзяцінства хацелі стаць прафесійнай тэнісісткай?***

— Пачала займацца з першага класа — хадзіла ў звычайны школьны гурток, а ўжо ў трэцім перайшла ў секцыю настольнага тэніса. Колькі сябе памятаю, як прыйшла ў залу маленькай васьмігадовай дзяўчынкай, ставілася да трэніровак вельмі сур'ёзна, заўсёды была настроена перамагаць. Пра тое, каб выбраць для сябе нейкі іншы прафесійны шлях, нават і не думала.

***— Сёння вы выступаеце і на дарослых, і на маладзёжных турнірах. Чым яны адрозніваюцца?***

— Мінулы год быў апошні, калі я выступала як юніёр, цяпер буду ўдзельнічаць толькі ў маладзёжных (да 21 года) і дарослых турнірах. На самай справе ў настольным тэнісе ўзрост адыгрывае не такую ўжо і вялікую ролю, усё залежыць ад узроўню саміх турніраў і гульцоў. Псіхалагічна мне лягчэй гуляць з дарослымі, там дзейнічаю больш расслаблена і ад гэтага лепш атрымліваецца. Магчыма, з-за таго, што адказнасці на дарослых турнірах на мне пакуль менш.

**«Калі браць мяне, то падчас гульні я стараюся не заўважаць балельшчыкаў і іх эмоцыі».**

***— Вы ўжо нават паспелі згуляць з алімпійскай чэмпіёнкай кітаянкай Дзін Нін...***

— Так, гэта было выдатна, мне спадабалася, хоць змагла «зачапіць» у яе ўсяго пару ачкоў. Такі вопыт вельмі карысны, можна было пагледзець многія моманты з гульні Дзін Нін: як яна вядзе яе, як выконвае тактычныя і тэхнічныя элементы. Падчас матча я не думала, што насупраць мяне — алімпійская чэмпіёнка, проста выходзіла і гуляла, як са звычайным сапернікам.

***— Трэнерскі штаб ускладае на вас вялікія надзеі ў будучыні. Гэта дадае адказнасці і хвалявання?***

— Надзеі ўскладаюць, але заўсёды робяць акцэнт на тым, што цяпер галоўнае не вынік, а якасць гульні і тое, як я вяду матч, — ці змагаюся за кожны мяч, ці выкладаюся на ўсе 100 працэнтаў.

***— Што самае галоўнае ў настольным тэнісе?***

— Тут важны комплекс, які складаецца з тэхнікі, тактыкі, псіхалогіі і фізічнай падрыхтоўкі. Непрыемна слухаць меркаванне, што настольны тэніс — прosta від спорту і фізічная падрыхтоўка там не патрэбная. На самай справе яна вельмі важная, каб валодаць вынослівасцю і хуткасцю, бо матч можа доўжыцца



больш за гадзіну (нeяк я гуляла сустрэчу 80 хвілін), а ў дзень звычайна праходзіць некалькі гульняў.

Настольны тэніс — гэта інтэлектуальны від спорту, у ім важна бачанне гульні, увесь час трэба сачыць за сапернікам, глядзець, да чаго ён рыхтуецца, і пралічваць свае варыянты. Перад матчам мы з трэнерам, вядома, разбіраем гульні, ён можа даць агульную ўстаноўку, але падчас сустрэчы даводзіцца арыентавацца на месцы.

***— Ведаю, што з нашай зборнай працуе псіхолаг, хоць многія спартсмены з іншых відаў спорту скептычна глядзяць на такую практыку...***

— У настольным тэнісе псіхалогія вельмі важная. Я з дзяцінства працую са спецыялістамі ў гэтай сферы. Мы можам размаўляць і не пра тэніс, галоўнае, што робіць псіхолаг, — ён дапамагае разабрацца ў сабе, тлумачыць, як настройваць сябе на спаборніцтвы, як паводзіць сябе на трэніроўцы, як рабіць правільныя ўстаноўкі і аналізаваць гульню пасля завяршэння матча.

***— Ці складана аднаўляцца пасля паражэнняў?***

— Яшчэ нядаўна вельмі хвалявалася пасля пройгрышаў, але паступова пачала ставіцца да іх прасцей. Бо пройгрыш — хоць і адмоўны, але таксама вынік. З яго трэба рабіць высновы і ісці далей, таму што, калі хвалюешся, марнуеш шмат часу ўпустую, не магу паўнавартасна правесці наступны матч. Паражэнні трэба прымаць і аналізаваць. А вось добрыя гульні, перамогі заўсёды падганяюць, даюць яшчэ больш сіл для трэніровак, хочацца дабівацца большага.

***— Перад гульнямі хвалюецеся?***

— Гледзячы якія спаборніцтвы і сапернікі: бывае зусім лёгкае хваляванне, а бывае вельмі моцнае. Тады трачу больш часу, каб падрыхтаваць сябе псіхалагічна і фізічна, вельмі добрая размінка да поту дапамагае зняць мандраж.

***— Вясной Мінск прыме чэмпіянат Еўропы (да 21 года) па настольным тэнісе. Як думаеце, ці збярэ турнір поўныя трыбуны?***

— Наш від спорту не вельмі папулярны ў краіне, але мы стараемся яго папулярызаваць, таму, вядома, хацелася б, каб сабраліся поўныя трыбуны, каб аматары спорту прыйшлі падтрымаць. Хоць калі браць мяне, то падчас гульні я стараюся не заўважаць балельшчыкаў і іх эмоцыі. А калі і звяртаю на іх увагу, то такая падтрымка толькі дапамагае.

***— Як маладой дзяўчыне ўдаецца сумяшчаць асабістае жыццё са спартыўным рэжымам?***

— Часам бывае цяжка, нават не столькі фізічна, як псіхалагічна. А ў цэлым нармальна, я хачу гуляць на высокім узроўні, таму разумею, што трэба працаваць. Зразумела, што ў мяне менш вольнага часу, бывае, не атрымліваецца кудысьці выбрацца, але гэта не моцна мяне напружвае. У выхадны дзень дазваляю сабе схадзіць на манікюр (добра, што пазногці ніяк не перашкаджаюць мне гуляць у тэніс, трымаць ракетку), у кіно, сустрэцца з сябрамі. А падчас больш працяглага адпачынку аддаю перавагу мору. Пабывала ўжо ў Балгарыі, Чарнагорыі, на Кіпры, мне вельмі там спадабалася.

**«На самай справе ў настольным тэнісе ўзрост адыгрывае не такую ўжо і вялікую ролю».**

***— Ці знаходзіцца ў гэтым графіку час на вучобу?***

— Так, вядома, цяпер я на другім курсе вучылішча алімпійскага рэзерву, скончу яго сёлета і атрымаю спецыяльнасць трэнера. Апошнія паўтара года вучоба даецца больш складана, але нават не ведаю, з чым гэта звязана. Хутчэй за ўсё, працягну навучанне ў ВНУ, праўда, яшчэ не абрала кірунак, магчыма, што гэтая адукацыя не будзе звязана са спортам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*lobazhevich@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 3.01.2018 г.

**Сяргей Белаяр скончыў гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, але калі вырашыў паспрабаваць свае сілы ў літаратурнай творчасці, то думкамі накіраваўся не ў сівую мінуўшчыну, а ў далёкі космас. І трэба прызнаць, што тут ён знайшоў сябе як творцу, пра што сведчаць яго перамогі ў розных літаратурных конкурсах. Ну, а ці дадасца да гэтых перамог яшчэ адна, дзякуючы яго ўдзелу ў сёлетнім звяздоўскім конкурсе на найлепшае апавяданне, даведаемся ўжо праз некалькі месяцаў.**

**Алесь БАДАК.**

Сяргей БЕЛАЯР



# СПАДАРОЖНІК

## Навукова-фантастычнае апавяданне

«...Для ажыццяўлення задуманага бортінжынер Далгор Банькоўскі выкарыстаў карбаранавую кіслату. Доза была разлічана такім чынам, каб сістэма ахаладжэння рэактара зламалася праз адну гадзіну сорак тры хвіліны. Гэта дазваляла бортінжынеру стварыць сабе алібі...»

Дзверы ў каюту, якую дзяліў з калекцыянерам-германістам Рудэлам Парыбокам інспектар Дэпартамента пазаземных крымінальных расследаванняў Ратаўт Сарва, адчыніліся, і на парозе паўстаў бледны як мел спадарожнік.

— Вам варта было б прыслухацца да рэкамендацый лекара, спадар Парыбок. А ён, калі мне не здраджвае памяць, загадаў выконваць пасцельны рэжым.

— Глупства, — адмахнуўся калекцыянер, беражліва раскладваючы на ложку бутэлькі. — Чым больш я буду рухацца, тым хутчэй прыйду ў норму.

— Налягаючы на эль? — выказаў здзіўленне інспектар.

— Ды кіньце вы, спадар Сарва! Што мне, нашчадку слаўных вікінгаў, станецца ад літра-другога піва? — Парыбок адкаркаваў бутэльку і зрабіў некалькі глыткоў. — Толькі горла прамачыць. Можаце быць упэўнены — рагаты шлем я не надзену і разбураць усё вакол не стану.

Сарва толькі прыгнечана паківаў галавою, не разумеючы таго, як можна настолькі безадказна ставіцца да свайго здароўя. І гэта — пасля аварыі. Аднак дастуквацца да розуму спадарожніка не стаў, а вярнуўся да справаздачы пра расследаванне, праведзенае на падвойным траянскім астэроідзе Юпітэра. Патрокл паднёс нямала сюрпрызаў.

«...Матывам злачынства стала жаданне прысвоіць сабе лаўры першаадкрывальніка экзапланеты зямнога тыпу...» Скончыць сказ інспектару не ўдалося — нагадаў пра сябе камунікатар. Рассыланне арыенціровак, калі меркаваць па піктаграме.

«Здзейсненыя дзёрзкія ўцёкі з турэмнага транспарту «Грыфон»... Арбіталіс Януць, прыгавораны да трох пажыццёвых зняволенняў за серыю забойстваў з асаблівай жорсткасцю ў Канадзе, ЗША і Бразіліі... Асабліва небяспечны».

ПРЫСУТНАСЦЬ шматлікіх лакун у тэксце магла быць растлумачана каранальным выкідам масы, які адбыўся некалькі гадзін таму. Замест фатаграфіі злачынцы — россып пікселяў.

— Нешта сур'ёзнае, спадар Сарва? — Парыбок адарваўся ад бутэлькі.

— Звычайнае паліцэйскае апавяшчэнне, — інспектар дакрануўся да тачскрына насупраць квадраціка «Пацвярджэнне атрымання», а затым запатрабаваў паўторнага адпраўлення. — Вам невымоўна пашанцавала.

— Гэта так, — кіўнуў Парыбок. — Абышоўся толькі парэзам на руцэ, а мог плаваць у адкрытым космасе да сутыкнення з такім жа бедалагам, як мой «Пегас»... Як успомню, што рабілася пасля сустрэчы з касмічным смеццем, дык адразу дрэнна становіцца. Добра, аварыйна-выратавальны модуль не падвёў.

— Іншы на вашым месцы кінуў бы ўсё, — рухам сціла Сарва закрыў файл на планшэтным персанальным камп'ютары. З завяршэннем справаздачы давядзецца пачакаць. Спадарожнік не ў тым стане, каб пакінуць інспектара сам-насам з дакументам.

— Прывык я да галаграфічнага праектара. Усю калекцыю з сабой не возьмеш, а часам у падарожжах хочацца дакрануцца да артэфактаў. Ведалі б вы, спадар Сарва, колькі ў мяне іх. Паўдома застаўлена... Вы дарма адмаўляецеся ад элю. Дзівосная рэч. З мядовым напоем вікінгаў, вядома, не параўнаецца, але ўсё ж... Пакаштуйце!

— У мяне праз чатыры дні адпачынак. Вось тады і пап'ю. Я, праўда, больш портару аддаю перавагу, але de gustibus non est disputandum. Густы ва ўсіх розныя.

— Дакладна. Вы, як я бачу, таксама неабыякавы да старажытных германцаў? — Намёк на рэпрынтнае выданне «De origine et situ Germanorum» Публія Карнэлія Тацыта і адкрытую на ноўтбуку «Тэўтонскую міфалогію» Якаба Людвіга Карла Грыма.

— Ды вось вырашыў папоўніць прабел у ведах.

— Вы не расчаруецеся, спадар Сарва. Адзін толькі Одзін чаго варты!.. Зараз я вам пакажу, — Парыбок паставіў бутэльку на стол і палез па галаграфічны праектар. З-за хмеля рухі калекцыянера былі нязграбнымі. — Вельмі ўжо каларытны персанаж!

ПАСЯРОД каюты паўстала аб'ёмная выява — адзіным вокам на Сарву глядзеў доўгабароды стары ў сінім плашчы і лямцавай шапцы, у суправаджэнні двух крумкачоў.

— Вярхоўны бог старажытных германцаў, конунг-шаман, знаўца рун, гаспадар Вальхалы, бог вайны і яшчэ шмат хто... — Парыбок пачаў дэманстраваць новыя выявы — ад

— Збіраецеся дапытаць мяне? — Калекцыянер жартаўліва пагразіў інспектару пальцам.

— Проста цікава, — не пакрывіў душой Сарва. Зноў жа — наўрад ці аповед зойме шмат часу. Балбатаць без прыпынку германіст мог выключна пра свае інтарэсы.

— Я арандаваў «Пегас» у «Міжпланетных вандровак» — іржавы металалом за вар'яцкія грошы, хоць і максімальна рабатызаваны. Стартаваў з Месяца і вырашыў дабрацца да Нептуна.

— Чаму менавіта да Нептуна?

— Лічыце гэта жаданнем выпрабаваць самога сябе, спадар Сарва. Хацеў адчуць, што азначала для маіх продкаў, калі яны падымаліся на палубу дракара і плылі ў пошуках прыгод.

— А чаго з сабой нікога не ўзялі? У кампаніі ўсё ж весялей і больш бяспечна.

— Захацелася трохі развеяцца, а ўсе сябры, як на злосць, аказаліся занятыя... — эль Парыбок піў быццам пасля доўгага ўстрымання. — Шчасна дабраўся да Нептуна, а на зваротным шляху сустрэў злашчаснае смецце... Не ведаю, што гэта было, але дасталося «Пегасу» няслаба. Ледзь паспеў дабрацца да модуля...

УСЛЕД пачуўся цяжкі ўздых. Парыбок здолеў працягнуць толькі праз некалькі хвілін.

— Куды ляцець, незразумела. Яшчэ і перадатчык выйшаў са строю... Пашанцавала, што «Ніка» пралятала міма. Прыйшлося ўзарваць паліва, якое яшчэ заставалася, каб мяне заўважылі... Тыдзень адзіночнага зняволення. Напэўна, менавіта галаграфічны праектар і не дазволіў мне звар'яцець...

— Вы — мужны чалавек, спадар Парыбок. Дазвольце паціснуць вашу руку! — Калекцыянер пераклаў бутэльку, каб адказаць. — Вам усё ж такі варта было б... Прашу мне прабачыць. Работа!

Інспектар выцягнуў камунікатар і дакрануўся да піктаграмы паведамлення. Паўтор. «Здзейсненыя дзёрзкія ўцёкі з турэмнага транспарту «Грыфон». Пункт прызначэння — ТСР №3, плутоід Хаумеа. Адшукваецца Арбіталіс Януць. Прыгавораны да трох пажыццёвых зняволенняў за серыю забойстваў з асаблівай жорсткасцю ў Канадзе, ЗША і Бразіліі. Асабліва небяспечны. Пры ўцёках забітыя два канваіры. Пры затрыманні можа аказаць супраціўленне».

І фатаграфія...

ПАРЫБОК меў па-сапраўднаму звярыны нюх — у імгненне вока ў яго руцэ аказаўся нож з высокавугляродзістай нізкалегіраванай нержавеючай сталі. І ён без ваганняў пусціў яго ў ход. Сарва шпурнуў у калекцыянера ноўтбук і, адштурхнуўшыся абедзвюма нагамі, паваліўся на падлогу, дзе выканаў падсечку. Парыбок перакуліўся на спіну і выпусціў нож, а астатняе ўжо было справай тэхнікі.

— Вы маеце права захоўваць маўчанне, — на ссунутых за спіну руках спадарожніка захліснулася пятля аднаразовай пластыкавай сцяжкі. — Усё сказанае вамі можа быць выкарыстана супраць вас...

ПАРЫБОК паспрабаваў аказаць супраціў, што дало інспектару права прымяніць да псеўдагерманіста сілу. Удар па нырках прымусіў Януця завыць.

— А, балюча!

— ...Разумееце свае правы? — Магутным рыўком Сарва паставіў уцекача, які несумненна ведаў «Правіла Эрнэста Міранды» не па чутках, на ногі і чаравікам адкінуў нож далей.

— Пусці!

— Вы разумееце свае правы? — Не зважаючы на вокрык, інспектар страсянуў Януця. Ды так, што ў таго ляснулі зубы.

— Так, так, разумею! — паспяшаўся запэўніць псеўдагерманіст.

— Вось і выдатна, — Сарва пасадзіў уцекача ў крэсла, пасля чаго звязаўся з капітанскім мосцікам і запытаў аб дапамозе. — Калі ўжо вы, спадар Януць, наважыліся выдаць сябе за калекцыянера, то паклапаціліся б пра тое, каб цалкам авалодаць прадметам. Ну які яшчэ Одзін у кантынентальных германцаў?.. Водан. Ад прагерманскага Wodanaz. Або Wodinaz. Одзін — гэта ў скандынаваў.

— Я абмовіўся.

— Зразумела, як жа інакш?.. Другое, на чым вы пракалоліся, спадар Януць, — гэта шлем. Былі б вы сапраўдным спецыялістам, вам ніколі б не прыйшло ў галаву сцвярджаць нешта падобнае. Вікінгі не насілі на ім рагоў. Цяжка і непрактычна. Іншая справа — гладкі шлем канічнай формы. Асацыяцыя рагатых шлемаў з вікінгамі адносіцца да другой паловы XIX стагоддзя, калі ў шэрагу еўрапейскіх дзяржаў пачынаецца адраджэнне міфалагічнай спадчыны. Пры перавыданні «Сагі пра Фрыцьёфа» сярэднявечных і да сучасных. Нейкай сістэмы ў падборы малюнкаў інспектар не адзначыў. — Старажытныя германцы шанавалі Одзіна больш за іншых багоў, а ўсё таму, што ён як ніхто іншы служыў увасабленнем духу народа... Merde! Які ж я няспрытны...

Сарва падаў ручнік калекцыянеру, які азіраўся, шукаючы анучу, — па стале, пагражаючы дабрацца да галаграфічнага праектара, расцякаўся эль з перакуленай бутэлькі. Прамакнуўшы лужыну, Парыбок шпурнуў пакамечаны ручнік у смеццевую скрыню. Туды ж адправілася і пустая бутэлька. Нядоўга думаючы, спадарожнік адкаркаваў новую.

— На чым мы спыніліся?.. Успомніў. У свой час я не пашкадаваў адзінаццаці тысяч на тое, каб купіць касцяную статуэтку Одзіна. Яна стала ўпрыгожваннем маёй калекцыі!.. Вам лепш не ведаць, спадар Сарва, колькі было выдаткавана грошай і намаганняў для таго, каб усё гэта сабраць...

З кожным новым глытком Парыбок станавіўся ўсё больш гаварлівы, а інспектару патрабавалася завяршыць справаздачу — кіраўнік Дэпартамента камісар Айнбунд чакаць не любіў. Але не будзеш жа затыкаць рот суразмоўніку. Тым больш, пасля аварыі яму трэба было выгаварыцца.

— ...Мне музеі прапануюць велізарныя грошы за калекцыю, але я не згаджаюся. Дарма, ці што, збіраў столькі гадоў?

Калекцыянер замоўк, каб зрабіць новы глыток, чым і скарыстаўся Сарва.

— З вашага дазволу, спадар Парыбок, як вам удалося выратавацца?

шведскі мастак-ілюстратар Густаў Малмстром намаляваў вікінгаў у рагатых шлемах. Пазней на аснове карцін Малмстрома Карл Эміль Доплер стварыў пазалочаныя шлемы з рагамі для пастаноўкі оперы Рыхарда Вагнера «Пярсцёнак Нібелунгаў»... Працягваць?

— Будзьце ласкавыя, спадар Сарва, — скрыгатнуў зубамі ўцякач.

— Ваша родная мова — французская. Ці не так, спадар Януць?

— Я пазбавіўся ад акцэнту яшчэ ў школе, — цверазіўся спадарожнік з такой жа хуткасцю, з якой у яго глотцы знікаў эль.

— Справа не ў акцэнце. Боль і спалох прымушаюць людзей лаяцца на роднай мове. Усё з-за таго, што ў чалавека з ёй моцная эмацыянальная сувязь... Ну і, нарэшце, ваша рука, — інспектар расшпіліў рукаў Януця, каб зняць бінтавую цыркулярную павязку. Пад ёй чарнела ідэнтыфікацыйная татуіроўка. — Такія робяць усім, хто адпраўляецца ў турму строгага рэжыму на Хаумеа. Вы нават не паморшчыліся, калі я сціснуў вашу далонь. А па «легендзе» рука пацярпела пры аварыі. Der Teufel steckt im detail. Перакласці?

— Ды якая розніца, што гэта значыць! — ускіпеў Януць.

— Германісту пераклад не спатрэбіўся б... Забітыя канваіры — вашыя супольнікі?

— Вы — не святар, каб я перад вамі спавядаўся. Ды й навошта?.. Мяне ж у любым выпадку чакае турма да самай смерці. А цешыць ваша самалюбства я не збіраюся.

— Ut tibi placet, — у каюце з'явіліся матросы. — Спадарства, пасадзіце гэтага чалавека пад варту.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, площадки на заводской территории**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Площадки на заводской территории** | Сооружение неустановленного назначения | 3406 кв. м | 110/С-112474 |

***Сведения о земельном участке***: пл. **1,1024** га, предоставлен продавцу для обслуживания площадок на заводской территории и проезда на праве постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0858 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 16 789,97 бел. руб. (снижение 80%)**

**Задаток 1% от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 06.12.2017 г.

**Аукцион состоится 23.01.2018 в 11.30** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.01.2018 до 17.00** по указанному адресу**. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by**

## ООО «Центр эксперт-услуг» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже доли в уставном фонде хозяйственного общества, принадлежащей ООО «Веста» УНП 400053655 (Гомельская обл., г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1)

| Лот № | Наименование объекта аукциона | Начальная цена лота без НДС, руб. | Задаток, руб. | Шаг аукциона 5%, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | 36/100 доли в уставном фонде общества с ограниченной ответственностью «Поливестстрой» УНП 490314781 | 176 000,00 | 1100,00 | 8 800,00 |

Задаток перечисляется на расчетный счет BY98PJCB30124035171000000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК PJCBBY2X, УНП 491058984, получатель платежа ООО «Центр эксперт-услуг», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 04.01.2018 г.

Аукцион состоится 19 января 2018 г. в 14.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 18 января 2018 г. до 14.00 по указанному адресу.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация о предмете аукциона размещены на сайте **auction.standard.by**.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5%, обязан:

в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить лицу (Заказчику или Исполнителю в соответствии с договором), понесшему затраты на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений, подготовку и публикацию рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам, в случае повторного выставления объекта на торги и определяется на основании представленных документов; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Заказчиком договор купли-продажи объекта (далее договор купли-продажи).

Результаты аукциона подлежат аннулированию организатором аукциона в случае, если победитель аукциона уклоняется или отказывается в установленные сроки от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением аукциона.

Организатором аукциона является ООО «Центр эксперт-услуг» (адрес: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а).

По вопросам участия в аукционе обращаться по телефонам: 8 029 648-83-06, тел./факс 8 0232 21-21-61.

## ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод» проводит открытый аукцион по продаже имущества

| № Лота | Наименование | Начальная цена с НДС, руб. РБ | Сумма задатка (10% от первоначальной цены) с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| 1 | Многофункциональное помещение транспортного назначения, инвентарный номер 620/D-17266, по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоменых, 46 | 35 071 руб. 69 коп. | 3 525 руб. 50 коп. |

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с BY58OLMP30121000155410000933 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, код банка OLMPBY2X, МФО 153001742, УНП 600004946, ОКПО 05550337.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 3 февраля 2018 г. в 14.00 по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых 46. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 29 января 2018г. до 12.00 по указанному адресу.

Контактные телефоны: 375 44 554-44-85, 375 29 262-58-34, 375 17 165-69-24.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Унитарного предприятия «Строительно-монтажное управление «Подъем» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: здание склада инв. № 100/С-62025 общей площадью 510,0 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 140100000001030221 площадью 0,1013 га по адресу: г. Брест, ул. Вычулки, 129/3 (далее — Объект).** *(земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона реки Мухавец, площадь – 0,1013 га).*

**Начальная цена с НДС (20%) – 165 000,00 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (16 500,00 бел. руб.) перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **05.02.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.02.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГРОДНО РЕМБЫТТЕХНИКА»

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот № 1** | | |
| Предмет торгов, краткая характеристика, сведения о земельном участке, местонахождение, информация | **Изолированное помещение инв. № 400/D-83397** (нежилое помещение на 1-м этаже пятиэтажного жилого дома) общей площадью 58 кв. м, железобетонные панели, 1971 г. п., кадастровый номер земельного участка 440100000002000706, г. Гродно, ул. Пролетарская, 71<br>*Информация: возможно использование нежилого помещения под размещение объекта общественного назначения по согласованию с заинтересованными службами города и УГАИ УВД Гродненского областного исполнительного комитета, с соблюдением требований технических нормативных правовых актов.*<br>*В случае реконструкции либо изменения целевого назначения использования нежилых изолированных помещений законодательством об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности в Республике Беларусь предусмотрена необходимость оформления разрешительных документов на разработку проектной документации и производство работ* | | |
| Обременения | Аренда по 31.10.2018 г. ( в случае продажи арендатор обязуется освободить помещение в течение 10 дней с даты заключения договора купли-продажи) | | |
| Начальная цена | **54 240 рублей с учетом НДС** | Сумма задатка (5%) | **2 712 рублей** |
| Сведения о продавце: ОАО «Гродно Рембыттехника», г. Гродно, пер. Виленский, 16, тел./факс 8 (0152) 77 14 79 | | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 дней с даты проведения торгов. Оплата по согласованию сторон. | | | |
| **Торги состоятся 26 января 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов | **по 22 января 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по тел.: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79; Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 21.10.2017 года | | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### Мотыкальский сельский исполнительный комитет Брестского района (организатор аукциона) извещает о проведении 6 февраля 2018 года открытого аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| № лота | Местоположение земельного участка и кадастровый номер земельного участка | Характеристика участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации и регистрацию земельного участка (руб) | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская обл., Брестский р-н, д. Скоки, ул. Солнечная, 22 № 121283006601000503 | **Земельный участок площадью 0,1265 га. Земельный участок имеет ограничения в использовании земель. Вид ограничений прав: охранная зона сетей и сооружений канализации площадью – 0,0060 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения площадью – 0,0030 га** | **0,1265 га** | 12000 | 1200 | 1418,48 руб.; + возмещение расходов на объявления в СМИ о проведении аукциона согласно акту выполненных работ | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома |
| **Аукцион будет проводиться 06.02.2018 г в 10.00 по адресу: Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома)** | | | | | | | |

Для участия в аукционе гражданин со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 1 февраля 2018 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 документы:**

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона (расчетный счет Мотыкальского сельисполкома BY60AKBB36410000002751000000 в филиале 100 БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Брест, код AKBBBY21100, УНП 200177486, назначение платежа «задаток за участие в аукционе»), с отметкой банка о его исполнении;

При подачи документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: **(8 0162) 94-91-36, (8 029) 761-92-84**

## Извещение
### 7 февраля 2017 года в 10.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций, условия предоставления | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона, и **дополнительно** расходы, связанные с публикацией объявления, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Земельные участки, предоставляемые **в частную собственность для коллективного садоводства** (земельные участки для коллективного садоводства) Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна». Имеется возможность подключения электроснабжения | | | | |
| 1 | Участок № 28 к/н 321084800019000060, площадь 0,1421 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок в связи с его расположением на площади: 0,1421 га на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож); 0,0673 га в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах объектов газораспределительной системы) | 9 614,26 | 1 068,2 | 961 |
| 2 | Участок № 10 к/н 321084800019000059, площадь 0,1165 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож) | 7 882,20 | 1040,72 | 788 |
| 3 | Участок № 32 к/н 321084800019000058, площадь 0,1028 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок в связи с его расположением на площади: 0,0006 га – в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт); 0,1028 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож) | 6 955,38 | 979,95 | 696 |
| 4 | участок № 84 к/н 321084800019000030, площадь 0,1015 га. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1015 га (водоохранная зона реки Сож) | 6 644,94 | 946,94 | 664 |
| 5 | Земельный участок площадью 0,1530 гектара, к/н 321080801201000283 **в аренду, сроком на 49 лет** для строительства и обслуживания магазина товаров повседневного спроса с аптечным киоском (земельный участок для размещения объектов иного назначения), расположен: Гомельская область, Гомельский район, Бобовичский сельсовет, д. Уза. Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади: 0,1530 га – в связи с его расположением в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги; 0,0272 га – в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт | 5 446,20 | 2 395,03 | 545 |

Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду, частную собственность по результатам аукциона: землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 123, телефон для справок: 8 0232 36-03-21

Условия предоставления земельных участков: в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления, по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель

Задаток вносится на р/с: Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123, тел. 36-03-21. Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 03.01.2018 по 01.02.2018 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии или организации и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию или организацию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за земельный участок или плату за право заключения договора аренды земельного участка;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков. Ознакомиться с земельным участком возможно при предварительном согласовании с землеустроительной службой Гомельского райисполкома, позвонив по телефону 36-03-21.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОНОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукционов** | Ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2 |
| **Продавец** | ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ», 212008, г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2, тел. 8 (0222) 72-77-72 |

**Предмет повторного аукциона**

**Лот № 1. Площадка открытого хранения полимерных труб большого диаметра (инв. № 700/С-102644),** площадью 2020,5 кв. м, адрес: г. Могилев, пер. Мечникова, 4-й, территория ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» по пер. Мечникова 4-й, 17

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | сооружение расположено на земельном участке, предоставленном Продавцу на праве постоянного пользования, площадью 0,2499 га |
| **Начальная цена** без НДС | **67 500 руб. 00 коп.** |
| **Шаг** аукциона | **3 375 руб. 00 коп.** |
| **Задаток** | **3 375 руб. 00 коп**. |

**Срок подписания договора купли-продажи:** 1 рабочий день после проведения аукциона

**Срок оплаты:** 3 рабочих дня со дня заключения договора купли-продажи, если иной срок не установлен договором купли-продажи

Предыдущие извещения об аукционе опубликованы в газете «Звязда» 23.11.2017, 27.12.2017

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **15 января 2018 г. в 12.00** г. Могилев, пер. Мечникова 4-й, 17/2, офис ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **12 января 2018 г. до 16.00** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |

**Предмет повторного аукциона**

**Лоты №№ 1–2. Оборудование,** по адресу: г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Шаг аукциона, бел. руб. без НДС | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 106 | **Бытовка строительная** | **1 000,00** | **50,00** | **50,00** |
| 2 | 195 | **Кузов** (кунг) | **200,00** | **10,00** | **10,00** |

**Срок подписания договора купли-продажи:** не позднее 1 рабочего дня после проведения аукциона

**Срок оплаты:** в течение 3 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иной срок не определен договором купли-продажи

Предыдущие извещения об аукционе – в газете «Звязда» 30.08.2017, 07.10.2017, 19.10.2017

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **15 января 2018 г. в 13.00** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, офис ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **12 января 2018 г. до 16.00** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |

**Задаток** перечисляется на р/с BY24 PJCB 3012 3008 8110 1000 0933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, код банка (БИК) PJCBBY2X. Получатель – ООО «СКТ ЗПТ», УНП 790104272. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «СКТ ЗПТ»

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления с предметом аукциона** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется с 8.00 до 17.30 (понедельник-пятница) по предварительному согласованию по тел. +375 (29) 631-19-51, Максим Александрович |

**Порядок оформления участия в аукционах и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина Республики Беларусь от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение о задатке. Информацию о документах, необходимых для участия в аукционе, порядке его проведения, оформления результатов вы можете получить по телефону +375 (44) 729-46-60, e-mail: jurist@sktzpt.by, Бураков Андрей Петрович.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 (29) 631-19-51, +375 (44) 729-46-60, +375 (29) 112-28-43, jurist@sktzpt.by** |



**ОАО «Амкодор-КЭЗ» 211060, ул. Промышленная, 3. Промышленная зона, г. п. Коханово, Толочинский район, Витебская область**

## Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 12 января 2018 года в 14.00 по адресу: Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества.

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.55.

Повестка дня:

1. Утверждение результатов размещения дополнительного выпуска акций ОАО «Амкодор-КЭЗ».
2. Утверждение решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Амкодор-КЭЗ».
3. Об увеличении уставного фонда ОАО «Амкодор-КЭЗ».
4. Утверждение изменений в устав ОАО «Амкодор-КЭЗ».

Основание созыва собрания – решение Совета директоров общества от 29 декабря 2018 года.

С информацией (материалами), подлежащей представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 5 января 2018 года в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность или договор).

ОАО «Амкодор-КЭЗ» на основании решения Совета директоров общества от 29 декабря 2017 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров определило дату формирования реестра акционеров – 29 декабря 2017 года.

### Информация о формировании реестра акционеров

– полное наименование и местонахождение акционерного общества: Открытое акционерное общество «Амкодор-КЭЗ», 21160, ул. Промышленная, 3, Промышленная зона, г. п. Коханово, Толочинский район, Витебская область;

– наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров: Совет директоров общества, 29 декабря 2017 года;

– дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров: 29 декабря 2017 года.

УНП 300028841


■ На кантролі

# ЛЁН АДСТАЕ

## У Гродзенскай вобласці шукаюць шляхі паляпшэння работы льнозаводаў

**На падтрымку двух ільнозаводаў у мінулым годзе накіравана 3 млн рублёў, сёлета за дзесяць месяцаў — амаль 1 млн 700 тысяч. Гэта самыя значныя датацыі ў шэрагу сельгаскультур рэгіёна. Але стан галіны параненейшаму нездавальняючы. З пачатку года агульныя страты заводаў склалі 2 млн рублёў. «Разбор палётаў» адбыўся з удзелам абласных улад, вытворцаў, прадстаўнікоў дзяржкантролю.**



Гнілая льнотраста ў ААТ «Карэлічы-Лён».

Як адзначыў **старшыня Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама Валерый ХЕЛСКІ**, рэгіён дабіўся добрых поспехаў у аграрным сектары. Гродзенская вобласць лідзіруе па збожжавай групе — тут самыя высокія ўраджаі па краіне, рэкордаў дабіваюцца аграрыі і ў вырошчванні караняплодаў. А вось лён па-ранейшаму стратны, хоць сюды накіроўваецца больш за ўсё сродкаў. Закупляецца элітнае насенне, выдзяляецца ў лізінг тэхніка, кожнаму раёну даведзены канкрэтныя плошчы пад пасевы. Дарэчы, за апошнія гады яны значна скараціліся, бо ў вобласці пайшлі па мінімізацыі льнаводства. Зараз тут замест чатырох працуе два льнозаводы — у Дзятлаўскім і Карэліцкім раёнах. Сюды размеркавана тэхніка, якая яшчэ магла працаваць. Вось толькі ўсе прынятыя захады не становяцца стымулам для вытворчасці, сцвярджае кіраўнік абласнога АПК. Прыбытак па льне атрымалі толькі ў адной гаспадарцы.

Да разгляду спраў падключыўся Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці. Спецыялісты высветлілі, дзе «слабыя» месцы ў вытворчасці культуры, якую спрадвеку вырошчвалі беларусы. У ходзе праверкі аказалася, што шэраг прычын носяць суб'ектыўны характар. Напрыклад, не забяспечваюцца тэрміны пасеваў, перыяд пад'ёму льнотрасты і яе якасць. Сёлета значна спазніліся з уборкай, таму каля 1 тысячы тон ільнотрасты захоўвалася з павышанай вільгаццю. Сярод пралікаў у арганізацыі ўборкі спецыялісты дзяржкантролю называюць непадрыхтаванасць тэхнікі і адсутнасць механізатараў. У гаспадарках Дзятлаўскага раёна з 19 прэспадборшчыкаў амаль палова не была гатова да работы. На Дварэцкім ільнозаводзе некалькі гадоў не задзейнічана важнае ў тэхналогіі абсталяванне — прэс, газаачышчальная і турбагенератарная ўстаноўкі, набытыя часткова за бюджэтныя сродкі. Як зазначыў **старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА**, ураджай будучага года можа аказацца пад пагрозай, таму што не ўсе палі падрыхтаваны да пасеву. Не наладжана работа новай лініі на ААТ «Карэлічы-Лён», тут не працуе вентыляцыя. Прыйдзецца ўкладаць дадатковыя сродкі для новай экспертызы.

Каб наступны год не стаў праўвальным, у рэгіёне пастаўлена задача перагледзець падыходы да льнаводчай галіны. Будзе наладжаны кантроль за тэхналагічным абсталяваннем заводаў. Мяркуецца пашырыць пасевы на 1 тысячу га льнопрыдатнымі землямі. На думку кіраўніцтва АПК, існуе рэзерв у арганізацыі працы. Варта пазбавіцца прастояў, а працаваць больш эфектыўна.

Самі вытворцы звяртаюць увагу на якасць насення і плануюць аддаваць перавагу замежнаму. На іх думку, беларуская эліта можа даваць ураджай пры цяплічных умовах, а не такіх, як сёлета. І наогул яны чакаюць ад навукоўцаў новых распрацовак, якія падыходзілі б да дадзенай кліматычнай зоны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# ПРАДУКТЫ — ЗА КОШТ ПАЦЫЕНТАЎ БАЛЬНІЦ

**Аператыўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама і Кастрычніцкага РУУС сталіцы ўстанавілі факт крадзяжу прадуктаў на гандлёвым прадпрыемстве, якое забяспечвае харчаванне ў некаторых бальніцах горада, а таксама ў анкалагічным цэнтры ў Бараўлянах.**

Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, 40-гадовая намеснік загадчыка нарыхтоўчага аб'екта гэтага прадпрыемства злоўжывала службовымі паўнамоцтвамі на працягу некалькіх гадоў. Яна выносіла прадукты харчавання: мяса, яйкі, малако, алей і іншае.

Наўмысна парушаючы тэхналогію прыгатавання, работніца змяншала порцыі для пацыентаў бальніц, а лішкі забірала сабе. І такім чынам забяспечвала прадуктамі не толькі сваю сям'ю, але і, як прызналася затрыманая, некаторую іх частку прадавала сваім знаёмым. У сярэднім за месяц яна крала харчавання на суму ад 100 да 150 рублёў.

Устаноўлена, што са жніўня 2016 года па ліпень 2017-га яна ўкрала прадуктаў на суму каля трох тысяч рублёў. За крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*


### ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении открытых торгов в форме аукциона

5 февраля 2018 года в 15.00 в г. Лепеле, ул. Ленинская, 6 (большой зал Лепельского райисполкома) состоятся открытые торги в форме аукциона (далее – аукцион) на предоставление права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (личинок хирономид), на территории озера Теклиц, расположенного в 13 км на северо-запад от города Лепеля у деревни Звезда Стайского сельсовета, сроком на 5 (пять) лет.

Организатор аукциона – Лепельский районный исполнительный комитет (тел. 802132 6 70 22).

Порядок проведения аукциона определен постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699 «Об утверждении Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства».

Согласно заключению Национальной академии наук Беларуси промысловый запас личинок хирономид на озере Теклиц составляет 40 кг/га, или 8080 кг со всей площади водоема. Предельно допустимый объем изъятия составит 2586 кг в год.

Начальная цена предмета аукциона составляет 20 базовых величин.

Задаток на участие в аукционе составляет 20% от начальной цены предмета аукциона, что составляет 4 базовые величины и вносится не позднее 1 февраля 2018 года. Сумма задатка перечисляется на р/с Лепельского райисполкома ***BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минска, BIC AKBBBY21214, УНП 300039625, ОКПО 040626632000.***

Аукцион проводится путем пошагового увеличения цены предмета аукциона – 15%.

К участию в аукционе допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Для участия в торгах юридическое лицо или индивидуальный предприниматель в сроки, указанные в извещении, подает в комиссию соответствующее заявление, заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении о проведении торгов, заверенную в установленном порядке копию свидетельства о государственной регистрации юридического лица или индивидуального предпринимателя.

В заявлении указывается, на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам аукциона. Документы принимаются до 31 января 2018 года до 17.00 (рабочие дни с перерывом на обед) по адресу: г. Лепель, ул. Ленинская, 6 (каб. 220), управление сельского хозяйства и продовольствия Лепельского райисполкома.

Победителем аукциона будет признано лицо, предложившее наибольшую цену.

Лицам, не выигравшим торги, задаток возвращается. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 5 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обязан внести плату за предмет аукциона за минусом внесенного задатка (сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации, необходимой для их проведения).

Адрес и номер контактного телефона комиссии: г. Лепель, ул. Ленинская, д. 6, Лепельский райисполком (кабинет 220, тел. 6 70 22).


■ Пераймайце!

# Крокавая даступнасць і значная эканомія

## У Гомелі адкрылі эксперыментальны жыллёвы комплекс з дзіцячым садком на першым паверсе

**Больш за 23 тысячы дашкольнікаў абласнога цэнтра забяспечаны месцамі, але не ўсе бацькі маюць магчымасць вадзіць дзіця ў садок каля дома. Новая ўстанова можа стаць прыкладам вырашэння гэтай праблемы для ўсёй краіны. Новы садок разлічаны на 60 дзетак.**

Ён быў запраектаваны і пабудаваны Гомельскім домабудаўнічым камбінатам. Актуальнасць відавочна — у маладым 19-м мікраёне Гомеля не хапае ўстаноў для дашкалят. Пры гэтым варыянт з убудаванымі памяшканнямі эканамічна выгадны для горада. Такім чынам скарачаюцца выдаткі на будаўніцтва камунікацый, больш эфектыўна выкарыстоўваецца прастора.

Аб'ект увялі датэрмінова. Яшчэ тры месяцы таму дом быў гатовы толькі на 35 %, а цяпер вось рыхтуецца прыняць маленькіх жыхароў. Таму тэрмінова сабрана мэбля, устаноўлена абсталяванне для харчаблока, памыты падлогі і вокны.

Дашкольнай установе прысвоены нумар 100. У ёй будзе тры групы па дваццаць дзяцей у кожнай. Агульныя — харчаблок, студыя для заняткаў танцамі, музыкай і гімнастыкай. У дзіцячым садку вядзецца кругласутачнае відэаназіранне, абсталявана санкавая, дзе ў зімовы перыяд бацькі могуць пакідаць санкі, улетку — самакаты і веласіпеды. Побач размешчана пляцоўка з верандамі і гульнявымі збудаваннямі. Уваходы ў дашкольную ўстанову і пад'езды ёсць з усіх бакоў будынка. Рух транспарту па тэрыторыі забаронены.

Ужо 3 студзеня 2018 года пачалася звычайная работа дашкольнай установы. Да яе гатовыя шэсць выхавальнікаў, два кухары, медыцынская сястра, пяць чалавек тэхперсаналу і тры вартаўнікі. На цырымоніі адкрыцця **старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА** адзначыў, што праект не стане першым і апошнім для Гомеля:

— Гэта альтэрнатыва звычайнаму тыпаваму дзіцячаму садку на 200—240 месцаў, будаўніцтва якога абышлося б у разы даражэй. Але галоўнае, мы даказалі: можна не чакаць лепшых часоў, не адкладаць будаўніцтва аб'ектаў інфраструктуры на нявызначаную будучыню, а кожны год уводзіць падобны аб'ект.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# Гараскоп стрыжак на студзень



***4 студзеня, чацвер.*** Стрыжка сёння стане пачаткам чарады сур'ёзных змяненняў у вашым жыцці. Калі вы не жадаеце нічога мяняць, перанясіце візіт да цырульніка на іншы дзень. Афарбоўваць валасы можна, аднак колер можа хутка страціць інтэнсіўнасць.

***5 студзеня, пятніца.*** Стрыжка надоўга захавае форму, валасы стануць больш густымі і моцнымі. Афарбоўванне, наадварот, пройдзе менш удала — колер хутка паблякне.

***6 студзеня, субота.*** Стрыжка можа стаць прычынай для канфлікту з блізкімі. Таксама неабходна з асцярожнасцю падысці да выбару фарбавальніка ў гэты дзень — аддайце перавагу безаміячным сродкам.

***7 студзеня, нядзеля.*** Новая стрыжка і абноўлены колер валасоў падораць зарад пазітыўнай энергіі на цэлы дзень, а таксама стануць прычынай прыўзнятага настрою. Смела запісвайцеся ў салон.

***8 студзеня, панядзелак.*** Спрыяльны час трохі абнавіць прычоску. Не бойцеся развітацца з даўжынёй і выбірайце цёплую карычневую або пшанічную колеравую гаму.

***9 студзеня, аўторак.*** Нейтральны дзень для паходу ў салон прыгажосці: можна трохі падраўняць кончыкі, аднак на больш сур'ёзныя перамены пакуль не зграджайцеся.

***10 студзеня, серада.*** Неспрыяльны дзень для наведвання цырульніка. Новая стрыжка можа нашкодзіць структуры валасоў, а таксама стаць прычынай працоўных канфліктаў.

***11 студзеня, чацвер.*** Сённяшні паход у салон прыгажосці можа расчараваць вас. Валасы могуць стаць непаслухмяныя, пачнуць хутка секчыся, а новы колер хутка паблякне.

***12 студзеня, пятніца.*** Няўдалы дзень для эксперыментаў. І стрыжка, і афарбоўванне могуць прывесці да непажаданых канфліктаў, а таксама стаць прычынай рэзкага пагаршэння самаадчування.

***13 студзеня, субота.*** Сёння можна рабіць стрыжку, аднак з часам пры ўкладцы валасы могуць стаць непаслухмяныя. У афарбоўванні выбірайце натуральныя фарбавальнікі, якія моцна не паўплываюць на колер.

***14 студзеня, нядзеля.*** Упэўнена адпраўляйцеся ў салон па новы вобраз — вынікам застанецеся задаволеныя. Спрабуйце новыя формы і колеры і не бойцеся эксперыментаваць — цяпер для гэтага найбольш прыдатны момант.

***15 студзеня, панядзелак.*** Сённяшняя стрыжка пазбавіць ад галаўнога болю. Пры афарбоўванні варта пазбягаць чорнага колеру — ён зробіць вас больш сталымі.

***16 студзеня, аўторак.*** Сённяшняя стрыжка паспрыяе паляпшэнню фінансавага дабрабыту. А ад афарбоўкі пакуль лепш адмовіцца.

***17 студзеня, серада.*** Нейтральны дзень для стрыжкі. Хна надасць валасам жыццёвай сілы.

***18 студзеня, чацвер.*** Стрыжка, зробленая сёння, не парадуе. А вось пафарбаваўшы валасы, прыцягнеце ў сваё жыццё поспех і ўдачу.

***19 студзеня, пятніца.*** Ёсць небяспека з валасамі адрэзаць поспех і дабрабыт. Удалым будзе асвятленне валасоў.

***20 студзеня, субота.*** Прыдатны дзень для стрыжкі. Афарбоўка зробіць валасы гладкімі і бліскучымі.

***21 студзеня, нядзеля.*** У гэты дзень лепш нарасціць валасы, а не стрыгчы іх. А змяніўшы колер, пагоршыце структуру валасоў.

***22 студзеня, панядзелак.*** Ідэальны дзень для догляду за валасамі. Варта фарбавацца ці не, вырашайце самі.

***23 студзеня, аўторак.*** Стрыжка ўзмоцніць інтуіцыю. Для афарбоўкі — нейтральны дзень.

***24 студзеня, серада.*** Не самы лепшы дзень. Новая стрыжка падкрэсліць усе недахопы. Афарбоўваць валасы можна, але ніхто гэтага не заўважыць.

***25 студзеня, чацвер.*** Спрыяльны дзень для экстравагантных стрыжак і меліравання.

***26 студзеня, пятніца.*** Добры дзень для стрыжкі. Пры афарбоўванні варта аддаць перавагу каштанаваму колеру.

***27 студзеня, субота.*** Стрыжка дабратворна адаб'ецца на ўмацаванні імунітэту. Афарбоўка валасоў пройдзе з прыгодамі.

***28 студзеня, нядзеля.*** Пазбаўляючыся ад пашкоджаных валасоў, ачысціце сваю аўру. Сёння можна фарбаваць валасы ў любы колер.

***29 студзеня, панядзелак.*** Стрыжка сёння стане падставай канфліктаў і сварак. Таксама лепш устрымацца ад хімічнага ўздзеяння на валасы.

***30 студзеня, аўторак.*** Неспрыяльны дзень для абнаўлення прычоскі. Афарбоўка валасоў прывядзе да хранічнай стомленасці.

***31 студзеня, серада.*** Стрыжка спрыяльна адаб'ецца на зносінах з процілеглым полам. Добры дзень для афарбоўкі валасоў.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 17.02 | 7.34 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.44 | 7.20 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.52 | 7.34 |
| Гомель — | 9.06 | 16.57 | 7.51 |
| Гродна — | 9.41 | 17.19 | 7.38 |
| Брэст — | 9.34 | 17.27 | 7.53 |

### Месяц

*Поўня 2 студзеня. Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

*Пр.* Дзмітрыя, Настассі, Фёдара.
*К.* Ангелікі, Анелі, Рыгора, Яўгена.



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СТУДЗЕНІ

**5, пятніца,** 0.00 — 9.30
**7, нядзеля,** 5.00 — 14.00
**9, аўторак,** 18.00 — 22.00
**11, чацвер,** 17.00 — 24.00
**12, пятніца,** 0.00 — 9.30
**14, нядзеля,** 11.00 — 21.30
**17, серада,** 8.30 — 11.00
**19, пятніца,** 14.00 — 22.30
**22, панядзелак,** 3.30 — 8.30
**24, серада,** 6.00 — 15.30
**26, пятніца,** 5.30 — 19.00
**28, нядзеля,** 12.30 — 21.00
**30, аўторак,** 19.00 — 22.00

## Даты | Падзеі | Людзі

### 4 СТУДЗЕНЯ






**1729** год — нарадзіўся (маёнтак Ясянец, цяпер у Баранавіцкім раёне) Іахім Храптовіч, грамадска-палітычны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, філосаф, публіцыст, паэт і перакладчык. З 1765 года — маршалак галоўнага трыбунала ВКЛ, з 1773-га — падканцлер літоўскі, адзін з арганізатараў і членаў Адукацыйнай камісіі. Кіраўнік каралеўскай групоўкі магнатаў і шляхты ў Вялікім Княстве Літоўскім; з 1791 года — міністр замежных спраў, з 1793-га — канцлер ВКЛ. У сваіх маёнтках у Шчорсах і Вішневе замяніў паншчыну аброкам, пабудаваў у Шчорсах палац, школу, уніяцкую царкву, арганізаваў багатую бібліятэку з архівам. Памёр у 1812 годзе.

**1869** год — нарадзіўся (в. Добасна, цяпер у Кіраўскім раёне) Ядвігін Ш. (Антон Івановіч Лявіцкі), беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў новай беларускай прозы. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. У 1890 годзе за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў арыштаваны, выключаны з універсітэта. Пасля вяртання ў Беларусь працаваў у Радашковічах, потым пераехаў з сям'ёй у фальварак Карпілаўка, дзе правёў большую частку жыцця. З 1909 года жыў і працаваў у Вільні: у газетах «Наша ніва» і «Беларус», часопісах «Саха», «Лучынка». Прымаў удзел у рабоце «Беларускай хаткі», быў намеснікам старшыні Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Бярозка», «Васількі», паэмы «Дзед Завала», кнігі «Успаміны», няскончанага рамана «Золата». Памёр у 1922 годзе.

**1948** год — нарадзіўся (г. п. Глуск Магілёўскай вобл.) Валерый Кірылавіч Іваноў, беларускі кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі. Сярод твораў: сімфоніі, кантаты, канцэрты, музыка да кіна- і тэлефільмаў і інш. Асноўныя дасягненні кампазітара — у жанры песні. Сярод іх: «Пахне чабор», «Тапаліны звон», «Гуляць дык гуляць», «Каханне» і іншыя на вяршы беларускіх паэтаў.




**1643** год — нарадзіўся Ісак Ньютан, англійскі фізік і матэматык, які стварыў тэарэтычныя асновы класічнай механікі і астраноміі. Адкрыў закон сусветнага прыцягнення. Памёр у 1727 годзе.

**1809** год — нарадзіўся Луі Брайль, французскі педагог, аўтар азбукі для сляпых. Яшчэ ва ўзросце 12 гадоў Брайль, пазнаёміўшыся з метадам пісьма выпуклымі літарамі Хаўі, пачаў работу над стварэннем спецыяльнага алфавіта для сляпых, які складаўся з розных камбінацый шасці выпуклых кропак (рэльефна-кропкавы шрыфт). Праз тры гады алфавіт быў гатовы. У ім былі не толькі літары, але таксама лічбы і знакі прыпынку. Гэты шрыфт быў названы па імені яго стваральніка «шрыфтам Брайля».

## УСМІХНЕМСЯ

**Навагодняя прымета. Колькі каўбасы ні падразай, а бутэрброды з ікрой скончацца першымі.**

— Я сваёй на Новы год падарыў дыяментавыя завушніцы, а яна мне паскудны адэкалон!
— А ты таксама хацеў дыяментавыя завушніцы?..

**«Дарагі Дзядуля Мароз! На мінулы Новы год я прасіла ў цябе хлопца. Дык вось, забяры назад гэтага казла і давай лепш мандарынкі!..»**

За навагоднім сталом.
— Сярога, што ты тварам у халадзец уткнуўся, перабірайся да мяне ў вінегрэт, а то прастудзішся!

**Два ўрачы на навагоднім карпаратыве, нарколаг і тэрапеўт. Нарколаг:**
**— Да вас, тэрапеўтаў, звярніся, дык вы чалавека залечыце!**
**Тэрапеўт:**
**— А да вас звярніся — закадзіруеце, і наогул год дарма пражывеш!**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 44.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 3 студзеня 2018 года.